Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ: МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**Электронны вучэбна-метадычны комплекс**

Брэст
БрДУ імя А.С. Пушкіна
2021

УДК 373.2.016:811.161.3'242(075.8)
ББК 74.268.19=411.3,5-243я73
С 99

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»*

*Аўтары:*
старшы выкладчык кафедры агульнаадукацыйных дасцыплін і методык іх выкладання
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
**М.І. Сянкевіч**

загадчык кафедры агульнаадукацыйных дасцыплін і методык іх выкладання
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**Г.М. Канцавая**

*Рэцэнзенты:*

кафедра філалогіі УА «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»

дацэнт кафедры беларускай філалогіі
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»,
кандыдат філалагічных навук
**В.М. Касцючык**

**Сянкевіч, М.І.** Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання: Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў : электронны вучэбна-метадычны комплекс / М. І. Сянкевіч, Г. М. Канцавая; Брэсцкі дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2021. – 100 с.

Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае тэарэтычны матэрыял, планы практычных заняткаў па методыцы развіцця маўлення малодшых школьнікаў, дадзены пытанні да экзамену, прапанаваны тэмы курсавых прац, заданні для кантрольнай працы, інтэрактыўны тэст для кантролю і самаправеркі ведаў.

Вучэбна-метадычны комплекс адрасаваны студэнтам спецыяльнасці 1-01 02 01 Пачатковае навучанне дзённай і завочнай формаў атрымання адукацыі.

# ЗМЕСТ


ПРАДМОВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

**ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ**

**1. Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення** **10**

1.1. Шляхі развіцця маўлення вучняў. Патрабаванні да фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

1.2. Тэарэтычныя асновы развіцця маўлення малодшых школьнікаў . 13

1.3. Асноўныя адрозненні вуснай і пісьмовай мовы . . . . . . . . . . . 14

1.4. Асноўныя прынцыпы методыкі развіцця маўлення малодшых школьнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

1.5. Патрабаванні да маўлення вучняў . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

**2. Напрамкі развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў** **19**

2.1. Фарміраванне навыкаў літаратурнага вымаўлення . . . . . . . . . 20

2.2. Методыка развіцця маўлення вучняў на лексічным узроўні . . . . 21

2.3. Навучанне малодшых школьнікаў рэдагаванню сказаў і асобных тэкстаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

2.4. Развіццё маўлення вучняў пры вывучэнні тэмы “Сказ” . . . . . . . 28

2.5. Удасканаленне навыкаў слухання (У. П. Саўко) . . . . . . . . . . . 30

**3. Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў** **32**

3.1. Паняцце “звязнае маўленне”. Асноўныя віды практыкаванняў у звязным маўленні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

3.2. Метадычныя асновы вывучэння тэмы “Тэкст” у пачатковых класах 34

3.3. Методыка навучання вусным пераказам розных тыпаў . . . . . . 39

3.4. Методыка працы над пісьмовым пераказам . . . . . . . . . . . . . 43

3.5. Методыка напісання сачыненняў розных тыпаў . . . . . . . . . . 47

3.6. Навучанне дзяцей напісанню некаторых відаў прац дзелавога стылю 53

**ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ** **56**

Практычныя заняткі № 1. Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення . . . 56

Практычныя заняткі № 2. Напрамкі развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў . . . 58

Практычныя заняткі № 3. Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў . . . 60

Практычныя заняткі № 4–5. Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення . . . 65

Кіруемая самастойная праца . . . 68

**РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ** **69**

Кантрольны тэст . . . 69

Кантрольная праца . . . 70

Пытанні да экзамену . . . 71

**ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ** **72**

Змест вучэбнага матэрыялу . . . 72

Спіс выкарыстанай літаратуры . . . 75

Тэматыка курсавых прац . . . 78

Гласарый . . . 80

Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі . . . 96

Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» ў агульнаадукацыйных установах з беларускай (рускай) мовай навучання» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Вучнёўскае сачыненне «Прыгожы лісток» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Вучнёўскае сачыненне «Восеньскі букет» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
Вучнёўскае сачыненне «Грыбнікі» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100

# ПРАДМОВА

Мэта вучэбна-метадычнага комплексу (ВМК) – кіраванне і самакіраванне вучэбнай дзейнасцю па развіцці прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў у працэсе засваення методыкі развіцця маўлення малодшых школьнікаў ва ўмовах установы вышэйшай адукацыі.

Вучэбна-метадычны комплекс уключае:

1) тэарэтычны раздзел (курс лекцый па раздзеле «Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў»);

2) практычны раздзел (планы практычных заняткаў, заданні для кіруемай самастойнай працы студэнтаў);

3) раздзел кантролю ведаў (інтэрактыўны тэст па раздзеле «Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў», пытанні да экзамену, якія забяспечаць студэнтам не толькі кантроль засваення тэорыі, але і больш прадуктыўнае асэнсаванне базавых метадычных паняццяў, асаблівасцяў зместу кожнага накірунку працы па методыцы развіцця маўлення, матэрыялы для правядзення кантрольнай працы па раздзеле «Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў»);

4) дапаможны раздзел (выпіска з вучэбнай праграмы па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання для спецыяльнасці 1-01 02 01 Пачатковая адукацыя (раздзел «Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў»), тэматыка курсавых прац, спіс выкарыстанай літаратуры па раздзеле, гласарый (тэрміналагічны слоўнік)).

**Мэтай** вывучэння раздзела «Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў» вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання” з’яўляецца фарміраванне гатоўнасці будучага настаўніка пачатковых класаў да рашэння прафесійных задач у галіне развіцця маўлення малодшых школьнікаў.

**Задачы:**

- сфарміраваць у студэнтаў уяўленне аб сучасных методыках удасканалення маўленчай дзейнасці малодшых школьнікаў, уменне аптымальна выбіраць даныя методыкі ў адпаведнасці са зместам вучэбнага матэрыялу, узроставымі магчымасцямі вучняў;
- сфарміраваць у студэнтаў уменне аналізаваць тэксты розных тыпаў і жанраў, падбіраць дыдактычны матэрыял да ўрокаў, праводзіць розныя віды пісьмовых творчых прац, аб'ектыўна ацэньваць веды, уменні і навыкі вучняў, правільна выкарыстоўваць нагляднасць і тэхнічныя сродкі навучання ў адукацыйным працэсе;
- стымуляваць творчыя пошукі студэнтаў, фарміраваць уменні працаваць з навукова-метадычнай літаратурай, развіваць навукова-даследчыя здольнасці, выхоўваць маральна-этычныя якасці, неабходныя сучаснаму настаўніку;
- сфарміраць у студэнтаў метадычныя кампетэнцыі, неабходныя для планавання, правядзення, аналізу і ацэнкі ўласных урокаў развіцця маўлення.

Згодна з адукацыйным стандартам засваенне студэнтамі дысцыпліны "Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання" забяспечвае фарміраванне наступных кампетэнцый:

**акадэмічныя кампетэнцыі:**

- умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;
- валодаць метадамі навукова-педагагічнага даследавання;
- валодаць даследчыцкімі навыкамі;
- умець працаваць самастойна;
- валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем;
- мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, кіраваннем інфармацыяй і працай на камп'ютары;
- валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі;
- умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю;
- умець рэгуляваць узаемадзеянне ў адукацыйным працэсе;

**сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

- быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;
- быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;
- быць здольным ажыццяўляць самаадукацыю і ўдасканальваць прафесійную дзейнасць;

**прафесійныя кампетэнцыі:**

- кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў;
- выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання;
- арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм;
- арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў;
- развіваць вучэбныя здольнасці навучэнцаў на падставе сістэмнай педагагічнай дыягностыкі;
- развіваць навыкі самостойнай працы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай і навуковай літаратурай;
- фармуліраваць адукацыйныя і выхаваўчыя мэты;
- ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця;
- ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне для ўдасканалення прафесійнай дзейнасці;
- арганізоўваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый;
- аналізаваць і ацэньваць педагагічныя з'явы і падзеі мінулага з улікам сучасных навуковых ведаў.

У выніку вывучэння раздзела «Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў» студэнт павінен:

***ведаць:***

- асноўныя паняцці методыкі развіцця маўлення малодшых школьнікаў: віды маўлення, маўленчая дзейнасць, віды маўленчай дзейнасці;
- мэты і змест працы па развіцці маўлення малодшых школьнікаў;
- прынцыпы методыкі развіцця маўлення;
- задачы развіцця маўлення вучняў;
- напрамкі развіцця маўлення;
- сістэму працы па развіцці звязнага маўлення;

***умець:***

- рэалізоўваць тэарэтычныя веды па методыцы развіцця маўлення малодшых школьнікаў у прафесійнай дзейнасці;
- падбіраць і выкарыстоўваць дыдактычны матэрыял у розных відах вучэбнай дзейнасці;
- спалучаць работу па засваенні вучнямі нормаў і законаў беларускай мовы з фарміраваннем камунікатыўных уменняў і навыкаў;
- выяўляць, класіфікаваць і папярэджваць маўленчыя памылкі рознага характару ў вусных выказваннях і пісьмовых працах вучняў пачатковых класаў;

***валодаць:***

- сістэмай работы па развіцці маўлення вучняў пачатковых класаў;
- навыкамі падрыхтоўкі і правядзення розных тыпаў урокаў па беларускай мове;
- метадамі арганізацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў;
- навыкамі ацэначнай дзейнасці вусных і пісьмовых работ навучэнцаў.

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 1. Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення

1. Шляхі развіцця маўлення вучняў. Патрабаванні да фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення.
2. Тэарэтычныя асновы развіцця маўлення малодшых школьнікаў.
3. Асноўныя адрозненні вуснай і пісьмовай мовы.
4. Асноўныя прынцыпы методыкі развіцця маўлення малодшых школьнікаў.
5. Патрабаванні да маўлення вучняў.

## 1.1. Шляхі развіцця маўлення вучняў. Патрабаванні да фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення

Асноўныя напрамкі развіцця маўленчых здольнасцей малодшых школьнікаў рэгламентуюцца існуючымі праграмамі.

Вучні пачатковых класаў атрымліваюць уяўленне пра мову як сродак зносін паміж людзьмі, засвойваюць правілы маўленчага этыкету, асноўныя арфаэпічныя нормы.

Лексічная праца прадугледжвае элементарныя звесткі пра ўжыванне слоў у прамым і пераносным значэнні, пра лексіка-семантычныя разрады слоў (сінонімы, антонімы, амонімы).

Дзеці вучацца пераказваць тэксты розных тыпаў, а таксама ствараць уласныя тэксты на зададзеную тэму вусна і пісьмова.

Папярэднія праграмы для пачатковай школы ўтрымлівалі такія раздзелы, як "Культура мовы" і "Літаратурная творчасць і імправізацыя". У сучасных нарматыўных дакументах гэтыя раздзелы адсутнічаюць, што цалкам апраўдана, бо культуры вуснага і пісьмовага маўлення, як і развіццю творчых здольнасцей вучняў, настаўнік павінен надаваць увагу пастаянна. Развіццё маўлення павінна адбывацца на ўсіх уроках школьнага цыкла, у пазакласных і пазашкольных мерапрыемствах. Усе віды працы па развіцці маўлення ўзаемна звязаныя і ўзаемна абумоўленыя.

Паколькі ў развіцці маўлення вучняў вядучая роля належыць настаўніку, абазначым найперш патрабаванні да яго самога як моўнай асобы. Педагагічныя работнікі не павінны дапускаць у сваім маўленні:

а) няправільна пабудаваных сказаў і зваротаў;

б) парушэнняў вымаўленчых нормаў;

в) неахайнасці ў выбары слоў.

Яны абавязаны:

– праводзіць сістэматычную работу па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў;

– фарміраваць культуру вуснага і пісьмовага маўлення вучняў;

– выкарыстоўваць формы пазакласнай і пазашкольнай дзейнасці для ўдасканалення маўленчай культуры сваіх выхаванцаў;

– рабіць разборлівым почыркам усе віды запісаў на дошцы, у журнале, у сшытках і дзённіках вучняў.

У сістэме працы па развіцці маўлення малодшых школьнікаў можна вылучыць тры этапы:

а) настаўнік вучыць дзяцей аналізу ўзораў літаратурнай мовы;

б) дзеці вучацца працаваць па ўзоры;

в) дзеці самастойна выконваюць творчыя працы на аснове набытых ведаў.

## 1.2. Тэарэтычныя асновы развіцця маўлення малодшых школьнікаў

Методыка развіцця маўлення вучняў абапіраецца на сучаснае беларускае мовазнаўства і літаратуразнаўства, псіхалогію, логіку і іншыя навукі. Кожная з іх тэарэтычна абгрунтоўвае пытанні, звязаныя з развіццём маўлення малодшых школьнікаў.

*Мовазнаўства.* Асаблівае значэнне набываюць законы фанетыкі, звязаныя з арфаэпіяй і націскам. Абапіраючыся на іх, настаўнік можа паспяхова навучаць дзяцей такім фанетычным нормам, як правільнае вымаўленне гукаў у словах, саміх слоў і іх спалучэнняў.

Пашырыць слоўнікавы запас дапамогуць такія раздзелы сучаснай беларускай мовы, як "Лексікалогія", "Марфалогія", "Сінтаксіс". З апорай на тэарэтычныя палажэнні гэтых раздзелаў пашыраецца і ўдакладняецца актыўны слоўнікавы запас, дзеці вучацца правільна выкарыстоўваць словы ў сказе.

*Літаратуразнаўства.* У аснове ўсёй працы па развіцці маўлення вучняў ляжыць мастацкі тэкст. Выкарыстоўваюцца дадзеныя аб тыпах тэкстаў, іх структуры, сродках стварэння мастацкага вобраза.

*Логіка.* Дзеці паступова авалодваюць такімі катэгорыямі логікі, як аналіз і сінтэз. Аналіз неабходны ім пры адборы слоў для складання выказвання, сінтэз – пры складанні сказаў і звязных тэкстаў.

*Псіхалогія.* Сучасная методыка развіцця маўлення вучняў шырока выкарыстоўвае дадзеныя псіхалогіі пра асаблівасці вуснай і пісьмовай мовы вучняў, унутранай і знешняй мовы.

## 1.3. Асноўныя адрозненні вуснай і пісьмовай мовы

У сваёй кнізе “Адзінства мэты” Шалва Аманашвілі расказвае, як ён дабіваўся таго, каб дзеці маглі выкласці свае думкі на паперы. На самым пачатку педагагічнай дзейнасці пісьмовую мову вучоны разумеў як суму двух складнікаў – вуснай мовы і тэхнікі пісьма. Аднак неўзабаве заўважыў, што дзеці, якія складна, бойка і эмацыянальна расказваюць розныя неверагодныя гісторыі, не могуць перадаць нават іх змест, пішуць так, нібы толькі што навучыліся гаварыць. Вось што пісаў Шалва Аляксандравіч:

“Нібы ручка, як той зачараваны ключык, наглуха замыкала дзверцы, праз якія павінна было выйсці слова, каб легчы на паперу. Я звярнуўся да метадычных распрацовак, а яны ў адзін голас сцвярджалі: вучы дзяцей пісаць прыгожа і арфаграфічна правільна, узбагачай іх мову новымі словамі, вучы вуснаму пераказу, а пісьмовая мова прыйдзе сама. Яна чакае на старэйшай узроставай ступені. Няхай пакуль дзеці спісваюць, пішуць пад дыктоўку, адказваюць на пытанні завучанымі на памяць фразамі. Не задумваўся я і над такой бязглуздзіцай, як пераказ вобразнага мастацкага апавядання «сваімі словамі». Дзеці псуюць мастацкі твор. Любы пісьменнік, калі б пабачыў, як дзеці здзекуюцца з яго твора, згубіў бы дар мовы. Зусім іншае, калі пісьменнік пераказвае сваімі словамі плады дзіцячай фантазіі. Патрабаванне пераказваць сваімі словамі выклікае агіду да мастацкай літаратуры. І смешна думаць, што такім чынам можна развіваць пісьмовую мову дзяцей”.

У выніку працяглых педагагічных пошукаў Шалва Аманашвілі прыйшоў да высновы, што развіццю пісьмовай мовы не садзейнічаюць featureрознага кшталту спісванні і дыктанты, што пісьмовую мову ў дзіцяці можна і патрэбна “разбудзіць” як найраней, з першага дня навучання ў школе, з дапамогай мэтанакіраванай методыкі. Ключ для разгадкі некаторых тайнаў пісьмовай мовы ў малодшых школьнікаў педагог знайшоў у працах Л. С. Выгоцкага.

Шалва Аманашвілі вылучае наступныя прынцыповыя адрозненні вуснай і пісьмовай мовы:

1. Вусная мова часцей за ўсё сітуацыйная. Толькі рыхтуючыся да адказнай сустрэчы ці тэлефоннай размовы, дарослы носьбіт мовы мадэлюе наперад і свае пытанні, і верагодныя адказы суразмоўцы. Дзецям падобнае дзеянне не ўласціва наогул.

Пісьмовая мова адарваная ад сітуацыйнасці, рэальнай рэчаіснасці. Гэта мова ўяўлення.

2. Вусная мова гукавая, актыўная, экспрэсіўная. На семантыку выказвання накладаецца яшчэ і асобасная семантыка. Падтэкстам выказвання выступаюць жэсты і міміка.

Пісьмовая мова адарвана ад гучання.

3. Вусная мова – дыялагічная, пісьмовая – маналагічная (ідзе размова з самім сабой, з чыстым лістом паперы).

4. Вусная мова хуткаплынная. Думкі "не стаяць у чарзе". Яны прыходзяць, іншым разам адыходзяць, губляюцца, неагучаныя. Дзіця не ў сілах трымаць думку ў памяці, "захоўваць" яе, каб пасля зрабіць элементам пісьмовага выказвання.

5. Вусная мова менш якасная. Вымаўленае слова можна ўдакладніць, паправіць, "забраць" назад. Пры карыстанні пісьмовай мовай няма доступу да сказанага. Яна вызначаецца дакладнасцю, завершанасцю, лагічнай яснасцю.

6. Вусная мова з самага пачатку матываваная, яе прызначэнне ў тым, каб выклікаць у рэцыпіентаў спачуванне, сурадасць. Мова наогул была б непатрэбна, калі б людзі жылі не ў грамадстве.

У пісьмовай мове матывацыя аддаленая ў часе.

Такім чынам, прыйшоў да заключэння вучоны, формула "вусная мова + навык пісьма = пісьмовая мова" навукова не абгрунтаваная, не пацверджаная практыкай.

Шалва Аманашвілі пачаў будаваць наступальную тактыку замест тактыкі "прыйдзе само". Перш за ўсё рэзка змяніліся практыкаванні па мове. Яны атрымалі

накіраванасць на падбор слова, рэдагаванне, фантазіраванне, развіццё логікі. Педагог стаў прапаноўваць дзецям свабодныя тэмы, каб яны маглі выказаць свае ўражанні, светаадчуванне, думкі, адносіны, ацэнкі. Дзеці палюбілі практыкаванні, у якіх трэба было:

– скласці апавяданне па загалоўку і групе словазлучэнняў;
– дапоўніць апавяданне па загалоўку, пачатку і канцоўцы;
– ажывіць і перадаць вобразна невыразны змест;
– правесці стылістычную праўку тэксту і інш.

Час ад часу вучні вярталіся да напісанага раней, пераглядалі яго, перапрацоўвалі. У практыку было ўведзена рэцэнзаванне і абмеркаванне пісьмовых прац з пункту гледжання чытача.

Для стымулявання пісьмовай мовы дзяцей педагог выкарыстоўваў выпуск кніг свайго выдавецтва, выпуск газеты, удзел у конкурсах, лісты літаратурным героям, пісьмы хворым сябрам, падрыхтоўку дакладаў на зададзеную тэму, вядзенне дзённікаў “Я сярод людзей” і інш.

І вынікі не прымусілі доўга чакаць сябе. Па словах самога Шалвы Аляксандравіча, нават слынныя навукоўцы, чытаючы сачыненні яго вучняў, лічылі, што трымаюць у руках працы студэнтаў філалагічнага факультэта, а не дзесяцігадовых школьнікаў.

І на цяперашні дзень патэнцыяльныя магчымасці пісьмовай мовы яшчэ не ў поўнай меры выкарыстоўваюцца настаўнікамі пачатковых класаў. Дыктанты, спісванне, пісьмо па памяці, пісьмовыя пераказы, шматлікія арфаграфічныя і граматычныя практыкаванні – усё гэта мала ўдасканальвае пісьмовую мову. Калі дзіця не стварае “сваё”, мы не вучым яго пісьмовай мове, якая (паводле акадэміка Л. В. Занкова) з’яўляецца *найважнейшым элементам самавыхавання*.

## 1.4. Асноўныя прынцыпы методыкі развіцця маўлення малодшых школьнікаў

Асноўныя з гэтых прынцыпаў былі абгрунтаваны яшчэ ў шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя. Назавём іх ніжэй.

*1. Прынцып адзінства мовы і мыслення.* Развіваць мысленне вучня – гэта значыць вучыць яго такім мысліцельным аперацыям, як параўнанне, аналіз, сінтэз, абагульненне, сістэматызацыя, індукцыя, дэдукцыя, уменне вызначаць часавыя сувязі і прычынна-выніковую залежнасць.

*2. Прынцып узаемасувязі ў рабоце па развіцці вуснага і пісьмовага маўлення.*

*3. Прынцып сувязі работы па развіцці маўлення з урокамі чытання і з вывучэннем граматыкі, арфаграфіі і пунктуацыі.* Гэтая сувязь арганічная. Пры вывучэнні асноўных раздзелаў граматыкі настаўнік увесь час працуе над развіццём дару слова, узбагачэннем маўлення вучняў літаратурнай лексікай.

*4. Прынцып стылістычнай накіраванасці ў рабоце па развіцці маўлення.* Паводле гэтага прынцыпу, на ўроках чытання, граматыкі і правапісу малодшыя школьнікі навучаюцца мастацкаму стылю мовы, авалодваюць элементамі фразеалогіі, вучацца пабудове сказаў, звязнаму маўленню, вусным і пісьмовым пераказам і сачыненням.

## 1.5. Патрабаванні да маўлення вучняў

Перш чым раскрываць сутнасць гэтых патрабаванняў, заўважым, што яны прад'яўляюцца да ўсіх носьбітаў мовы, а не толькі да вучняў.

***Дакладнасць.*** Вучні павінны вучыцца выказваць свае думкі без скажэнняў рэчаіснасці.

***Лагічнасць.*** Яна вызначаецца паслядоўнасцю выкладання думкі (без пропускаў і паўтарэнняў), а таксама доказнасцю аргументаў і фактаў, абгрунтаванасцю вывадаў. Класічны прыклад алагічнага выказвання: "Ішоў дождж і два студэнты: адзін у паліто, а другі ва ўніверсітэт".

***Чыстата маўлення.*** Неабходна папярэджваць ўжыванне вучнямі дыялектызмаў, слоў, значэнне якіх дзеці не разумеюць, слоў-"паразітаў", жарганізмаў. Тут да месца прывесці выказванне Л. Талстога: "Я загадаў бы публічна біць розгамі тых, хто ўжывае слова, значэння якога ён не ведае".

***Багацце маўлення.*** Гэта велічыня слоўнага запасу. Сучасны адукаваны чалавек мае 11–13 тыс. слоў у актыўным слоўнікавым запасе і прыкладна столькі ж – у пасіўным. Для цікаўных: слоўнік Т. Шаўчэнкі налічвае 10 тыс. слоў, С. Ясеніна – 18 тыс. 890 слоў, А. С. Пушкіна – 21 тыс. 197 слоў.

***Выразнасць.*** Гэта наяўнасць у лексічным запасе носьбіта мовы вобразных сродкаў (метафар, параўнанняў, эпітэтаў, фразеалагізмаў і інш.).

***Сцісласць і лаканічнасць.*** Такое выказванне, калі колькасць моўных адзінак скарачаецца, але павялічваецца ці застаецца нязменнай колькасць адзінак інфармацыі, называюць лаканічным. У гэтай сувязі прывядзём жартоўны прыклад:

У слыннага прафесара спыталі:

– Колькі вам патрэбна часу, каб падрыхтаваць выступленне на дзве хвіліны?

– Два тыдні, – адказаў той.

– А на дваццаць хвілін?

– Два дні.

– А на дзве гадзіны?

– Ды хоць цяпер.

***Стылявая дарэчнасць.*** У адным выказванні не павінны змешвацца розныя стылёвыя пласты мовы. Вось прыклады парушэння гэтага прынцыпу: "Васіль уласнай персонай схадзіў па квас", "На зялёных насаджэннях распусціліся першыя лісточкі".

## 2. Напрамкі развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў

1. Фарміраванне навыкаў літаратурнага вымаўлення.
2. Методыка развіцця маўлення вучняў на лексічным узроўні.
3. Навучанне малодшых школьнікаў рэдагаванню сказаў і асобных тэкстаў.
4. Развіццё маўлення вучняў пры вывучэнні тэмы “Сказ”.
5. Удасканаленне навыкаў слухання.

## 2.1. Фарміраванне навыкаў літаратурнага вымаўлення

Правільнае літаратурнае вымаўленне павінна ўвесь час быць у полі зроку настаўніка. Педагог абавязаны ведаць тыповыя недахопы ў вымаўленні малодшых школьнікаў і спосабы выпраўлення.

Неабходна таксама, каб мова самога педагога была ўзорнай. Правільным літаратурным вымаўленнем вучні авалодаюць толькі тады, калі на ўроках чытання і роднай мовы будуць сістэматычна праводзіцца практыкаванні ў выразным чытанні, завучванні на памяць вершаў і скорагаворак.

Асобныя аспекты фарміравання навыкаў літаратурнага вымаўлення разглядаліся намі ў тэмах "Методыка вывучэння асноў фанетыкі" і "Якасці паўнацэннага навыку чытання і прыёмы іх выпрацоўкі".

## 2.2. Методыка развіцця маўлення вучняў на лексічным узроўні

Адзін з найважнейшых накірункаў працы па развіцці маўлення малодшых школьнікаў – колькаснае ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў. Аднак методыка працы па развіцці маўлення вучняў на лексічным узроўні не зводзіцца толькі да гэтага. Адначасова вырашаецца шэраг іншых задач, а іменна:

а) удакладненне лексічнага значэння і сферы выкарыстання вядомых дзецям слоў;

б) развіццё ўменне актыўна карыстацца назапашанымі словамі ў вуснай мове і пры выкананні пісьмовых творчых прац;

в) замена дыялектных і іншых слоў у слоўніку дзяцей літаратурнымі;

г) праца над дакладнасцю і мэтазгоднасцю ўжывання слоў у залежнасці ад тэмы і стылю тэксту, які ствараецца;

д) назіранне за роляй вобразных сродкаў мовы.

Крыніцы ўзбагачэння слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў самыя розныя. Пералічым асноўныя з іх:

а) зрокавыя (чытанне кніг і падручнікаў, дзіцячых перыядычных выданняў);

б) слыхавыя (маўленне настаўніка і дарослых, слуханне радыё і прагляд дзіцячых тэлеперадач, кінафільмаў і тэатральных пастановак);

в) зрокава-слыхавыя (наведванне музеяў і выстаў).

Слоўнік вучняў трэба ўзбагачаць з улікам граматыка-арфаграфічных цяжкасцяў слоў, а таксама з улікам іх сэнсавай каштоўнасці для папаўнення слоўнікавага запасу вучняў.

***Слоўнікавая праца на ўроках літаратурнага чытання.*** Слоўнікавая праца вядзецца на ўсіх уроках школьнага цыкла, але найбольшая ўвага надаецца ёй на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання.

Пакольkі пра сутнасць і задачы лексічнай працы на ўроках літаратурнага чытання падрабязна гаварылася намі раней, у тэме “Асноўныя віды працы на ўроках літаратурнага чытання. Слоўнікавая праца”, удакладнім толькі асобныя моманты працы з вобразнымі сродкамі мовы, больш падрабязна спыніўшыся на разуменні малодшымі школьнікамі такіх з’яў, як сінанімія і антанімія.

Практыкаванні з сінонімамі могуць мець наступны характар:

– тлумачэнне адценняў значэнняў і адрозненняў у выкарыстанні слоў-сінонімаў;

– падбор сінонімаў, якія могуць стаць заменай для дадзенага, высвятленне адценняў значэнняў;

– градацыя сінонімаў;

– выпраўленне маўленчых памылак.

На ўроках чытання ў пачатковых класах могуць быць выкананы наступныя практыкаванні з антонімамі: падбор антонімаў да прапанаваных слоў; складанне сказаў з антонімамі; замена антонімаў у сказах; працяг сказаў з антонімамі па прапанаваным пачатку; падбор антонімаў да мнагазначных слоў і складанне паралельных сінанімічных радоў.

На ўроку можна арганізаваць гульню ў тропы (эпітэты і іншыя сродкі мастацкай выразнасці). З гэтаю мэтаю настаўнік запісвае на дошцы тэкст (празаічны ці вершаваны), дзе трэба ўставіць прапушчаныя словы. Дзеці ўносяць свае прапановы, калектыўна абмяркоўваюць іх. Перамагае той, хто запіша аўтарскі варыянт тропа. Такая літаратурная задача, як і задача арыфметычная, мае толькі адзін правільны адказ. Падобныя заданні выхоўваюць у вучняў дакладнасць маўлення, развіваюць у іх здольнасць разумець невыпадковасць, мастацкую значнасць словаўжывання.

У творах для чытання ў пачатковых класах сустракаецца дастаткова вялікая колькасць фразеалагізмаў. Тлумачэнне фразеалагічных адзінак трэба праводзіць не толькі шляхам замены іх адпаведнымі сінонімамі, але і спосабам разгорнутага тлумачэння з указаннем на іх выяўленчую ролю. Неабходна сур’ёзна працаваць над выкарыстаннем дзецьмі фразеалагічных адзінак у пераказах прачытаных тэкстаў і ва ўласным маўленні.

Працуючы над вобразнымі сродкамі мовы, настаўнік павінен мець на ўвазе дзве наступныя акалічнасці:

– недапушчальна рабіць высновы адносна творчай манеры аўтара на аснове рознага кшталту падлікаў, займацца “словатлумачэннем”;

– перавод вобразных паэтычных сродкаў у слоўныя малюнкі апраўданы толькі пры аналізе выразных зрокавых вобразаў, найчасцей у эпічных творах;

– працуючы са сродкамі моўнай выразнасці, настаўнік павінен пастаянна звяртаць увагу дзяцей на тое, у якой ступені і з якога боку яны характарызуюць прадмет, чаму менавіта гэтыя, а не іншыя тропы выкарыстаў пісьменнік і з якой мэтай;

***Слоўнікавая праца на ўроках беларускай мовы.*** Усе віды слоўнікавых практыкаванняў, якія выконваюцца на ўроках беларускай мовы, можна падзяліць на:

*а) слоўнікава-граматычныя практыкаванні.* Яны служаць сродкам замацавання граматычных ведаў вучняў і адначасова ўзбагачаюць мову малодшых школьнікаў. Напрыклад, пры вывучэнні часцін мовы праводзяцца наступныя слоўнікава-граматычныя практыкаванні:

– класіфікацыя слоў па часцінах мовы (будаўнік, будаваць, будаўнічы, будоўля);

– утварэнне слоў з іншым значэннем і аднакарэнных слоў іншых часцін мовы пры дапамозе прыставак і суфіксаў;

– вызначэнне, якой часцінай мовы з’яўляецца пэўнае слова;

*б) слоўнікава-лагічныя практыкаванні.* Яны вучаць параўноўваць, абагульняць і сістэматызаваць прадметы і з’явы. Прыклады такіх практыкаванняў:

– падвядзенне відавых паняццяў пад родавыя: асіна, бяроза, сасна, вярба, алешына – дрэвы;

– аб’яднанне прадметаў у групы на аснове прызначэння, функцыі і г. д. (мэбля, школьныя прыналежнасці, прафесіі і інш.);

– падзел паняцця: назавіце звяроў нашых лясоў, назавіце драпежных звяроў

нашых лясоў; назавіце птушак, якія жывуць у нашых лясах, назавіце птушак, якія адлятаюць ад нас на поўдзень;

*в) слоўнікава-стылістычныя практыкапванні.* Такія практыкаванні выпрацоўваюць увагу да значэння слова, а таксама дакладнасць і вобразнасць маўлення. Вось некаторыя з іх:

– падабраць да слова сінонімы і антонімы;
– скласці сказы з сінонімамі;
– замяніць словы, якія паўтараюцца ў тэксце, сінанімічнымі.

## 2.3. Навучанне малодшых школьнікаў рэдагаванню сказаў і асобных тэкстаў

Рэдагаванне можна разглядаць як спецыфічны від слоўнікава-стылістычных практыкаванняў.

Выконваючы творчыя працы, малодшыя школьнікі імкнуцца пачаць і завяршыць іх адразу, што не можа не адбіцца на якасці напісанага. Пісьмовую самастойную працу любога ўзроўню нельга ўявіць без настойлівых пошукаў слова, уставак і выпраўленняў.

Настаўнік, які хоча навучыць дзяцей рэдагаванню, перш за ўсё павінен добра засвоіць асноўныя тыпы лексічных памылак вучняў і мець уяўленне аб прычынах і спосабах папярэджання такіх памылак. Над кожнай з груп памылак ён працуе на ўроках мовы паралельна з засваеннем граматычных тэм, прымаючы пад увагу і эфектыўна выкарыстоўваючы тыя магчымасці, якія дае матэрыял. Так, напрыклад, вывучаючы тэму “Склад слова”, неабходна папярэдзіць паўтор аднакарэнных слоў (тыпу здараюцца здарэнні, падарылі падарункі, святкавалі свята, гулялі ў гульню). “У сказе не павінна быць роднасных слоў”, – кажа педагог. (Фразеалагізмы і нямногія прыклады такога кшталту з класічнай літаратуры – згадаем хрэстаматыйнае “Лицом к лицу лица не увидать...” – хутчэй выключэнне, чым правіла.)

Пры кожнай зручнай нагодзе настаўнік павінен звяртаць увагу на тое, якое слова выбраў аўтар. Прывядзём прыклад выканання задання такога тыпу. На дошцы запісаны фрагмент мастацкага твора з прапушчанымі дзеясловамі (прыклад узяты з вядомай народнай казкі “Як цар-леў хвасты раздаваў”).

*“Тым часам пачалі збірацца да цара звяры. Першай ... ліса. За лісіцаю ... вавёрка. За ёю ... конь. Апошнім ... зайка. А мядзведзь ... сабе памаленьку – кульгець, кульгець, усё вакол разглядае”.*

Вучні шукаюць найбольш трапныя дзеясловы (прыбегла, прыскакала, прытупацеў, прытрусіў, сунецца). Высвятляецца, чаму менавіта гэтыя дзеясловы выкарыстаны ў казцы, як яны характарызуюць звяроў, на якія іх якасці ўказваюць.

Заўважыць мастацкую адпаведнасць слова дапамагаюць пытанні і заданні настаўніка:

– Знайдзіце слова, якое малюе…

– Знайдзіце слова, якое падкрэслівае…

– З якой мэтай ужыта слова..?

– Чаму аўтар менавіта так называе..?

– Якімі словамі аўтар перадае сваё адчуванне ад..?

Час ад часу карысна практыкавацца ў рэдагаванні асобных сказаў з моўнымі і лексіка-граматычнымі памылкамі:

Вожык *зматаўся* ў клубок. Хлопчыкі *будуюць* снежную бабу. Зрэдку *ходзяць* дажджы. Сняжынкі *сыпаліся* на кусты бэзу пад акном.

Вучні называюць значэнне памылковага слова, матывуюць немэтазгоднасць яго выкарыстання ў сказе, складаюць сказы, дзе памылковае слова "стаіць на сваім месцы".

Калектыўна складзены сказ з аднароднымі членамі няцяжка перабудаваць у звязны тэкст. Напрыклад, сказ "Па першым снезе прайшлі і пакінулі сляды лось, заяц, ліса" пры жаданні можна пераўтварыць у звязнае выказванне з чатырох сказаў: *На світанку выпаў пушысты і мяккі снег. Прабегла па першым снезе хітрая ліса. Няспешна прайшоў лясны прыгажун лось. Пад густой ялінкай відаць сляды баязлівага зайчыка.*

Працу над асобнымі групамі памылак карысна спалучаць з калектыўным рэдагаваннем тэксту. Рэдагаванне будзе больш актыўнае, калі правесці яго ў выглядзе конкурсу на званне лепшага рэдактара (па колькасці прынятых прапаноў). Само выпраўленне памылак неабходна праводзіць як мага тактоўней. Замест катэгарычных характарыстык "правільна – няправільна", "дрэнна – добра" лепш прымяняць такія, як "удала – няўдала", "да месца – не да месца", "мэтазгодна – немэтазгодна". Адны прапановы настаўнік прымае, робіць праўкі ў тэксце, іншыя аргументавана адводзіць.

Карысна расказаць дзецям, якую нялёгкую працу выконваюць рэдактары дзіцячых газет і часопісаў. У вучняў, якія рэгулярна чытаюць перыядычны друк, часам складваецца ўражанне, што матэрыялы ў газету (вершы, апавяданні, замалёўкі) дасылаюць толькі выдатнікі ды звышэрудыты, настолькі ўсё ў іх "складна" і правільна. Гэта акалічнасць выклікае няўпэўненасць нават у здольных вучняў. Між тым творы нават прафесійных літаратараў не абыходзяцца без рэдактарскай праўкі. Для зручнасці выпраўленні лепш паказваць крэйдай (у сшытках чарнілам) рознага колеру.

Ад франтальнай працы з класам можна пераходзіць да індывідуальнага рэдагавання тэкстаў. Вучні чацвёртага класа здольныя ўдасканаліць уласныя сачыненні, напісаныя ў трэцім класе. Настаўнік можа і спецыяльна "сапсаваць" тэкст.

Навучанне малодшых школьнікаў рэдагаванню ўласных творчых прац – адзін з ключавых напрамкаў асэнсавання ёмістасці і выразнасці моўных адзінак. Звычка не задавальняцца першым, што трапіў пад руку, матэрыялам, а настойліва і мэтанакіравана шукаць адзінапрыдатнае для кожнага выпадку слова павінна выпрацоўвацца носьбітамі мовы з самых першых больш-менш самастойных практыкаванняў у пачатковых класах і працягвацца пажыццёва.

Прапанаваная намі работа павінна ажыццяўляцца ў наступнай паслядоўнасці:

а) праца над групамі стылістычных і моўных памылак у сувязі з вывучэннем граматычных тэм;

б) калектыўная праца па рэдагаванні спецыяльных тэкстаў і сачыненняў;

в) індывідуальная праца па рэдагаванні спецыяльна падабраных тэкстаў.

## 2.4. Развіццё маўлення вучняў пры вывучэнні тэмы “Сказ”

Пры вывучэнні тэмы “Сказ” выкарыстоўваюцца наступныя віды практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў:

1. Поўны адказ на пытанне настаўніка.

На першапачатковым этапе навучання пытанне настаўніка служыць асновай для пабудовы сказа. У ім дадзены амаль усе словы і пазначана структура сказа, якi вучні павінны скласці. Паступова пытанні ставяцца так, каб дзеці ўводзілі 2–3 свае словы. Напрыклад:

– *Што рабілі дзеці ў лесе?*

– *Дзеці ў лесе збіралі грыбы.*

Калі настаўнік працяглы час будзе задаваць пытанні, пры адказе на якія дастаткова дадаць усяго адно слова, ён пачуе прыкладна наступнае: *Дзеці ў лесе рабілі збіралі грыбы.*

Пазней пытанні прымушаюць вучня даваць адказы ў выглядзе складаных сказаў. Гэта пытанні тыпу: *чаму? навошта? з якой мэтай? пры якой умове?* Пытанне можа даць тэму для сказа, звязнага выказвання.

Так складанне сказа па пытанні з практыкавання па ўзоры ператвараецца ў творчае практыкаванне.

2. Складанне сказаў па ўзоры (можна мяняць лік назоўнікаў, час і асобу дзеяслова).

3. Складанне сказаў па малюнках і серыі малюнкаў.

4. Складанне сказаў з разрозненых слоў (розныя формы).

5. Дапаўненне сказа па пытанні (пытаннях).

6. Падзел тэксту на сказы.

7. Увядзенне ў сказ дадзеных членаў па пытаннях.

8. Злучэнне двух простых сказаў у адзін складаны ці ў сказ з аднароднымі членамі.

9. Складанне сказаў па зададзенай сінтаксічнай схеме.

10. Рэдагаванне сказаў.

11. Складанне сказаў па апорных словах і інш.

У заключэнне заўважым, што настаўніка не павінны задавальняць прымітыўныя сказы, складзеныя вучнямі. Малодшыя школьнікі павінны рабіць гэта на максімальным узроўні сваіх магчымасцяў. Карысна арганізаваць творчае спаборніцтва на складанне лепшага сказа.

## 2.5. Удасканаленне навыкаў слухання (У. П. Саўко)

Аўдзіраванне – від маўленчай дзейнасці, звязаны з успрыманнем і асэнсаваннем вуснага маўлення.

Ва ўмовах рэальнай камунікацыі аўдзіраванне выконвае тры асноўныя функцыі:

1) з'яўляецца маўленчым дзеяннем, накіраваным на атрыманне інфармацыі;

2) з'яўляецца кампанентам маўленчых зносін, якія ажыццяўляюцца ў вуснай форме;

3) можа выступаць ў ролі маўленчага дзеяння, якое выкарыстоўваецца з мэтаю кантролю за ўласным маўленнем пры гаварэнні, чытанні і пісьме.

Уменне слухаць пачынае фарміравацца ў раннім узросце і спадарожнічае чалавеку ўсё жыццё. У школе аўдзіраванне – адзін з найбольш важных шляхоў атрымання вучэбнай інфармацыі, таму тут звяртаецца ўвага на тое, каб навучыць дзяцей успрымаць на слых маўленне настаўнікаў, выказванні аднакласнікаў, змест розных тэкстаў і інш.

У працэсе ўдасканалення навыкаў аўдзіравання неабходна мець на ўвазе, што працэс успрымання вуснага маўлення складаецца з наступных кампанентаў: распазнаванне маўленчых адзінак, іх сэнсавая перапрацоўка і на аснове гэтага разуменне пачутага.

Настаўніку таксама трэба памятаць, што асэнсаванае ўспрыманне вуснага маўлення залежыць ад многіх фактараў: наколькі зразумела выказваецца чалавек, які тэмп і тон яго маўлення, ці ўмее ён выдзеліць у выказванні асноўнае, зацікавіць слухачоў і г.д. У сваю чаргу, многае залежыць і ад субяседніка, аўдыторыі, ад іх умення слухаць, падрыхтаванасці да ўспрымання пэўнай інфармацыі, жадання яе засвоіць і інш.

Выдзяляюцца наступныя віды ўспрымання вуснага маўлення: глабальнае, дэталёвае і крытычнае.

*Глабальнае* ўспрыманне накіравана на разуменне агульнага сэнсу паведамлення.

Гэта значыць, што той, хто слухае, можа, напрыклад, вызначыць тэму тэксту, сказаць, якая асноўная думка выказвання, і інш.

*Дэталёвае* ўспрыманне садзейнічае поўнаму і дакладнаму разуменню сэнсу ўсяго выказвання. Напрыклад, вучні павінны дэталёва ўспрымаць тлумачэнне новага матэрыялу, тэкст падрабязнага пераказу і інш.

*Крытычнае* ўспрыманне патрабуе і глабальнага, і дэталёвага ўспрымання, а таксама крытычнага асэнсавання пачутага. Арыентацыя на крытычнае ўспрыманне адбываецца, напрыклад, тады, калі неабходна выказаць свой погляд на падзеі, з'явы, пра якія гаварылася ў тэксце, аргументавана пагадзіцца ці не пагадзіцца з думкай субяседніка, выдзеліць і запісаць асноўныя палажэнні выказвання і інш.

Для ўдасканалення навыкаў аўдзіравання выкарыстоўваюцца наступныя метадычныя прыёмы:

– арыентацыя вучняў на неабходнасць пэўнага віду ўспрымання тэксту (Тое, што я скажу, вам неабходна абавязкова запомніць, таму што...);

– псіхалагічная падрыхтоўка да ўспрымання зместу тэксту (Слухаючы тэкст, вы зразумееце...);

– патрабаванне знайсці ў вусным тэксце (асобных сказах) пэўныя моўныя адзінкі: лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і інш.;

– запіс у час слухання слоў, словазлучэнняў, якія дапамогуць узнавіць змест выказвання;

– канспектаванне тэксту;

– гутарка па змесце праслуханага тэксту;

– аналіз тэксту: вызначэнне тэмы, асноўнай думкі, стылю і г. д.;

– падрабязны, сціслы, выбарачны пераказ тэксту.

Удасканальваючы навыкі аўдзіравання, неабходна звяртаць увагу і на фарміраванне культуры слухання. Школьнікі павінны ведаць, што ва ўменні слухаць праяўляецца павага да субяседніка ці субяседнікаў, выхаванасць, агульная культура чалавека.

## 3. Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў

1. Паняцце “звязнае маўленне”. Асноўныя віды практыкаванняў у звязным маўленні.
2. Метадычныя асновы вывучэння тэмы “Тэкст” у пачатковых класах.
3. Методыка навучання вусным пераказам розных тыпаў.
4. Методыка працы над пісьмовым пераказам.
5. Методыка напісання сачыненняў розных тыпаў.
6. Навучанне дзяцей напісанню некаторых відаў прац дзелавога стылю.

## 3.1. Паняцце “звязнае маўленне”. Асноўныя віды практыкаванняў у звязным маўленні

Звязным лічыцца маўленне, якое арганізавана па законах логікі і граматыкі, уяўляе адзінае цэлае, мае тэму, валодае адноснай самастойнасцю і закончанасцю. У пачатковай школе выкарыстоўваюцца наступныя віды практыкаванняў у звязным маўленні:

– разгорнутыя адказы на пытанні настаўніка;
– вусныя выказванні вучняў па зададзенай тэме, па малюнку, па назіраннях;
– запісы на аснове назіранняў;
– расказванне завучанага на памяць;
– розныя віды драматызацыі і інсцэніравання;
– стварэнне ўмоўных дыяфільмаў; вуснае маляванне;
– спробы ва ўласнай літаратурнай творчасці;
– вусныя і пісьмовыя пераказы тэкстаў;
– напісанне сачыненняў розных тыпаў;
– замалёўкі ў газету, водгукі аб прачытаным, інтэрв’ю;
– напісанне дзелавых папер (аб’явы, пісьмы) і інш.

Гэтыя практыкаванні накіраваны на развіццё вуснага і пісьмовага, маналагічнага і дыялагічнага маўлення. Розная таксама ступень самастойнасці вучняў.

Малодшыя школьнікі павінны авалодаць наступнымі ўменнямі па развіцці звязнага маўлення:

– уменне зразумець, асэнсаваць тэму, знайсці яе межы;
– уменне падпарадкаваць сваё выказванне асноўнай ідэі;
– уменне збіраць матэрыял, адбіраць тое, што важна, што адносіцца да тэмы і адкідваць другараднае (такая работа патрабуе сістэматычных назіранняў і нават запісаў);
– уменне сістэматызаваць матэрыял, размяшчаць яго ў пэўнай паслядоўнасці, складаць план і пісаць па плане;
– уменне выкарыстоўваць моўныя сродкі ў адпаведнасці з літаратурнымі нормамі і задачамі выказвання;
– уменне ўдасканальваць напісанае (рэдагаваць).

## 3.2. Метадычныя асновы вывучэння тэмы “Тэкст” у пачатковых класах

***Сістэма вывучэння тэмы “Тэкст”.*** Вывучэнне граматычнага матэрыялу па беларускай мове ў пачатковых класах вядзецца з апорай на тэкст. Тэкст, які засвойваюць малодшыя школьнікі, – гэта некалькі сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе.

У другім класе вучні знаёмяцца з сувяззю сказаў у тэксце, вучацца адрозніваць тэкст ад набору не звязаных між сабою слоў, падбіраць да тэксту загалоўкі, вызначаць яго тэму і асноўную думку.

У трэцім класе малодшыя школьнікі знаёмяцца з апавядальнымі і апісальнымі тэкстамі, вучацца складаць план тэксту і пераказваць па плане.

Чацвёртакласнікі атрымліваюць веды аб асноўных сродках сувязі сказаў у тэксце, аб структурных частках апавядальных і апісальных тэкстаў. Яны вучацца таксама распазнаваць тэксты-разважанні, пад кіраўніцтвам настаўніка сцісла пераказваць па плане апавядальныя і апісальныя тэксты.

***Тэма і асноўная думка тэксту.*** Тэма – гэта тое, пра што гаворыцца ў тэксце. Яна можа быць абазначана ў загалоўку ці ў адным са сказаў. Акрамя тэмы, тэкст мае асноўную думку. Асноўная думка тэксту – гэта тое галоўнае, што аўтар хоча сказаць, паведаміць, растлумачыць чытачу, у чым ён хоча чытача пераканаць; гэта яго (аўтара) адносіны да прадмета выказвання. Іншымі словамі: *дзеля чаго пісаўся тэкст?* Пакажам на прыкладзе, як можна правесці працу з тэкстам у другім класе.

*Андрэйка*

*Андрэйка жыве ў Брэсце. Яму сем гадоў. Хлопчык вучыцца ў другім класе. Ён любіць чытаць і маляваць. Учора тата купіў Андрэйку кніжкі і новыя алоўкі.*

Прачытаўшы тэкст, настаўнік пытае, пра каго ў ім гаворыцца. Засяроджваецца ўвага на загалоўку, які звязаны з тэмай, – *пра Андрэйку.* Галоўная мэта аўтара тэксту – *пазнаёміць дзяцей з Андрэйкам і яго захапленнямі.*

***Загаловак тэксту.*** Разгледзім некалькіх тыпаў загалоўкаў:

а) *тэматычныя загалоўкі* паказваюць на тое, пра што пойдзе размова ў тэксце, абазначаюць месца дзеяння (“Зіма”, “У вёсцы летам”, “У лесе” і інш.);

б) *паведамляльныя загалоўкі* ў самым агульным выглядзе даюць магчымасць уявіць, пра што пойдзе размова ў тэксце (“Хлопчык марыць”, “Птушкі прыляцелі”, “Будуем домікі для птушак” і інш.);

в) *даволі часта ў загалоўках выказана аўтарская пазіцыя, абагульненая думка* (“Нішто не заменіць нам хлеба”, “Май – свята прыроды” і інш.).

У спецыяльнай літаратуры выдзяляюцца яшчэ *эмацыянальна-ацэначныя загалоўкі* (“Ну і грыб!”), *парадаксальныя* (“Кнігі, сшыткі. . . і тры качаны капусты”, *праблемныя* (“Віна ці бяда?”, “Хто вінаваты?”), *пабуджальныя* (“Лесу шумець!”, “Кветкам цвісці!”).

***Віды тэкстаў.*** Тэкст, у якім расказваецца пра якія-небудзь падзеі ці здарэнні, называецца ***апавяданнем.*** Да тэксту-апавядання можна паставіць пытанне “Як гэта было?” (такое азначэнне даецца ў трэцім класе).

У падручніку для чацвёртага класа паведамляецца, што тэкст-апавяданне можна падзяліць на тры часткі:

1) пачатак падзеі;

2) разгортванне падзеі;

3) заканчэнне.

Апавяданне – адзін з найбольш лёгкіх для ўспрымання дзецьмі відаў тэксту: ён дынамічны, мае сюжэт, дзейных асоб.

Для пабудовы апавядання вялікае значэнне мае падбор дзеясловаў (найчасцей руху), ужыванне займеннікаў, сінанімічныя замены. Хуткасць і паслядоўнасць дзеянняў дапамагаюць перадаць словы і словазлучэнні *раптам, у той жа час, потым, пасля, праз хвіліну, праз некалькі хвілін, тады, раней, нарэшце, такім чынам* і інш.

З сінтаксічнага боку такія тэксты характарызуюцца наяўнасцю простых сказаў,

а таксама складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часу і месца. Пэўнае месца займаюць таксама бяззлучнікавыя складаныя сказы.

Для апавядальнага тэксту характэрна наяўнасць дыялогаў.

Часта апавядальныя тэксты ўтрымліваюць элементы апісання.

***Тэкст-апісанне*** прадугледжвае пералічэнне прымет прадметаў, з'яў і характарызуецца статычнасцю. Да тэксту-апісання можна паставіць пытанні "Які гэта прадмет?", "Як ён выглядае?".

Тэкст-апісанне складаецца з дзвюх частак:

1) агульнае ўражанне ад прадмета, яго назва;

2) раскрыццё прымет прадмета.

Можа быць і трэцяя частка, якая дае ацэнку прадмета (пра гэта гаворыцца ў чацвёртым класе).

Тэксты-апісанні можна класіфікаваць паводле таго, якая з'ява ці прадмет апісваецца:

а) апісанне прыроды (пейзаж);

б) апісанне памяшкання (інтэр'ер);

в) апісанне прадмета;

г) апісанне месца падзеі;

д) апісанне знешнасці чалавека (партрэт);

е) апісанне характару чалавека;

ж) апісанне працоўных працэсаў і інш.

У апісанні, як правіла, усе дзеясловы стаяць у адной часавай форме. Характэрна ўжыванне дзеясловаў незакончанага трывання прошлага часу. У такім тэксце многа прыметнікаў і дзеепрыметнікаў.

З сінтаксічнага боку апісальныя тэксты характарызуюцца наяўнасцю двухсастаўных сказаў з састаўнымі іменнымі выказнікамі. Калі апісанне мастацкае, то яно ўтрымлівае метафары, эпітэты, параўнанні і іншыя вобразныя сродкі мовы. Часта ўжываюцца загалоўкі, якія называюць прадмет маўлення.

***Тэкст-разважанне*** – адзін з самых складаных спосабаў перадачы думкі, які патрабуе ведаў, жыццёвага вопыту, аналітычных здольнасцей. У тэксце-разважанні тлумачацца або даказваюцца прычыны розных здарэнняў, падзей. Такі тэкст можна падзяліць на тры часткі:

1) назва таго, што тлумачыцца ці даказваецца;

2) тлумачэнне таго, што адбываецца;

3) вынік або вывад пра падзею або здарэнне. Іншымі словамі: *тэзіс, доказ, вывад.*

З марфалагічнага боку для такіх тэкстаў характэрна ўжыванне падпарадкавальных злучнікаў *так як, таму што*, абстрактных назоўнікаў.

З сінтаксічнага боку шырока ўжываюцца складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі ўмовы, уступкі, прычыны; пабочныя словы.

У загалоўках часам даецца ўказанне на адносіны залежнасці паміж прадметамі (“Лес – крыніца здароўя”, “Любіць прыроду – любіць Радзіму”), абазначаны праблемныя пытанні (“Кім я буду”, “Чаму трэба берагчы ўсё жывое?”, “Калі людзі радуюцца”).

У сваіх сачыненнях вучні пачатковых класаў часцей за ўсё ўжываюць толькі элементы разважання.

Вучні пачатковых класаў у практычным плане знаёмяцца з *тэкстамі-дыялогамі* і *тэкстамі-маналогамі.* Асобныя рэплікі ў *дыялогах* – гэта зварот, паведамленне, пытанне, пабуджэнне, удакладненне, пярэчанне і г. д. Рэплікі звязаны па сэнсе і складаюць адзінае цэлае. У дыялогах асаблівае значэнне набываюць інтанацыя, жэст, міміка. Для іх характэрна ўжыванне няпоўных сказаў, слоў-сказаў, выклічнікаў, часціц, звароткаў. Ужыванне поўных сказаў у дыялогу магчымае толькі ў дыдактычных мэтах.

*Маналог* – значны па аб’ёме від тэксту, які патрабуе ад таго, хто гаворыць, пэўнай падрыхтоўкі, плана.

Усе тэксты можна падзяліць на *празаічныя* і *вершаваныя.* Для вершаваных тэкстаў характэрна наяўнасць рыфмы, рытму, чляненне сказа на пэўныя адрэзкі. (За адным разам заўважым, што рытм можа быць і ў празаічным творы.)

У пачатковых класах вывучаюцца як *мастацкія*, так і *навукова-пазнавальныя* тэксты.

***Тэкставыя практыкаванні.*** У рабоце з тэкстам павінна існаваць свая паслядоўнасць – ад больш простых практыкаванняў з тэкстам да больш складаных. Так, напрыклад, на першым этапе можна прапанаваць вучням наступныя заданні:

– устаў у прапанаваны тэкст прапушчаныя словы, словазлучэнні, сказы;

– узнаві дэфармаваны тэкст (з перастаўленымі сказамі ці абзацамі);

– дапоўні тэкст словамі і словазлучэннямі.

Вучні на аснове дадатковых запісаў (табліцы, схемы, даведкі) самастойна ці з дапамогай настаўніка выконваюць заданні.

Калі праца вядзецца на ўроку беларускай мовы, пры рабоце з тэкстам карысна выканаць дадатковыя заданні пошукавага характару з розных раздзелаў праграмы: арфаграфіі, сінтаксісу і інш.

На наступных этапах працы можна выкарыстоўваць такія заданні:

– замяні невыразную назву тэксту больш дакладнай (фразеалагізмам, цытатай з тэксту);

– дапоўні тэкст дадзенымі членамі сказа;

– складзі план тэксту;

– складзі тэкст па апорных словах;

– знайдзі і выправі ў тэксце моўныя памылкі;

– прадоўжы тэкст;

– складзі дыялог на аснове тэксту і інш.

## 3.3. Методыка навучання вусным пераказам розных тыпаў

***Асноўныя патрабаванні да вуснага пераказу.*** Такіх патрабаванняў два:

а) у пераказе павінна гучаць жывая мова самога школьніка, узор не павінен быць механічна завучаны;

б) неабходна выкарыстоўваць лексіку, моўныя і сінтаксічныя канструкцыі, узятыя з узорнага тэксту, захаваць яго стыль, паслядоўнасць перадачы ўсіх асноўных фактаў, прычынна-выніковыя сувязі.

Мова ўзорнага тэксту засвойваецца пры чытанні, падчас гутаркі, аналізу. У пераказе вучань выкарыстоўвае і "свае" словы. Гэта непазбежна і нават карысна ў пэўных межах. Добра, калі ў пераказе адаб'юцца пачуцці дзіцяці, яго жаданне зацікавіць іншых дзяцей, яго захапленне. Нічога не дае сухі пераказ з нудным прыпамінаннем. Забараняецца пераказваць блізка да тэксту байкі, вершаваныя казкі, вершы.

Вельмі карысна, каб ініцыятыва пераказаць апавяданне зыходзіла ад саміх вучняў.

Якасць пераказу залежыць ад таго, як тэкст прачытаны, ці правільна зразумелі яго дзеці, ці засвоілі мову і асноўную думку. Пераказ звычайна адзін з апошніх этапаў урока, але рыхтавацца да яго неабходна на працягу ўсяго ўрока. Для гэтага неабходна ўлічваць наступныя акалічнасці:

– у пачатку ўрока настаўнік папярэджвае, што апавяданне (казку, дзелавы артыкул) неабходна будзе пераказаць (падрабязна, сцісла, выбарачна);

– пры аналізе зместу праводзяцца розныя віды прац над мовай тэксту, у працэсе чаго выдзяляюцца словы, словазлучэнні і сказы, якія, на думку настаўніка, трэба выкарыстаць у пераказе;

– пераказу папярэднічае работа над выразным чытаннем;

– перад тым як тэкст будзе пераказвацца, ён дзеліцца на часткі і да кожнай з частак падбіраецца загаловак;

– настаўнік ацэньвае якасць пераказу кожнага вучня, разбірае недахопы, дае парады; сваю ацэнку могуць выказаць і дзеці.

Пераказу трэба вучыць сістэматычна, бо канчатковая мэта пераказу ў тым, каб і ў жыцці чалавек умеў дастаткова поўна і паслядоўна перадаць пачутае і прачытанае.

Час ад часу варта практыкаваць пераказ тэксту пасля першаснага чытання, пераказ сцэнічнай пастаноўкі і інш.

***Навучанне падрабязнаму пераказу.*** Падрабязны пераказ – найбольш просты від пераказу. Ён выкарыстоўваецца часцей за іншыя. Пачынаць лепш за ўсё з апавядальнага сюжэтнага тэксту (апавядання ці казкі). Не рэкамендуецца браць невялікія па аб'ёме тэксты (дзеці завучаць іх на памяць). Калі вучань расказвае, яго слухае ўвесь клас, а не толькі адзін настаўнік.

Рыхтуючы да пераказу, настаўнік павінен папярэдзіць магчымыя недахопы:

*а) няўменне пачаць.* Звычайна першую фразу дзеці завучваюць на памяць. Трэба пераканаць іх, што пачаць апавяданне ці казку можна і па-свойму;

*б) падрабязны, амаль даслоўны пераказ першай часткі і скажэнне наступных.* Гэты недахоп папярэджваецца падрабязным аналізам апавядання, асабліва яго галоўнай часткі. Аблягчае працу пераказ па частках, прычым не абавязкова па парадку. Карысна пачаць з галоўнай часткі;

*в) рэзкае збядненне мовы.* У такіх выпадках настаўніку неабходна больш увагі ўдзяліць працы над слоўнікам і вобразнымі сродкамі мовы.

***Навучанне выбарачнаму пераказу.*** Пераказаць выбарачна – значыць выбраць з тэксту тую яго частку (часткі), якія адпавядаюць вузкай тэме.

Існуюць наступныя віды выбарачных пераказаў:

а) пераказ па пытанні ці заданні;

б) пераказ па ілюстрацыі (трэба пераказаць тую сцэну ці карціну, якой адпавядае ілюстрацыя);

в) выбарка з розных месцаў апавядання матэрыялу па адной з яго тэматычных ліній (звычайна настаўнік перад гэтым дае час, каб дзеці яшчэ раз перачыталі твор моўчкі, выбралі адпаведныя ўрыўкі і пазначылі іх алоўкам; пасля высвятляецца, якія ўрыўкі дзеці выбралі і чаму).

***Навучанне сцісламу пераказу.*** Пераказваць трэба ўмець не толькі падрабязна, але і канспектыўна, сцісла. Гэта намнога цяжэй, бо трэба адабраць самае важнае і адкінуць другараднае. Скарачэнне тэксту не павінна праходзіць механічна, без адбору.

Не рэкамендуецца сцісла пераказваць мастацкія апісанні, творы высокай моўнай культуры.

Ступені скарачэння тэксту могуць быць пададзены наступнай схемай: *поўны тэкст → падрабязны пераказ → сціслы пераказ → план тэксту → складаназалежны сказ (у ім выказваецца галоўная думка тэксту).*

Магчымы і зваротны шлях.

Не абавязкова патрабаваць, каб у сціслым пераказе быў разгорнуты кожны пункт плана.

Сціслыя пераказы неабходны, але празмернае захапленне імі можа прывесці да збяднення мовы вучняў, адцягне ўвагу дзяцей ад мастацкіх дэталяў. Таму трэба правесці выразную мяжу паміж падрабязнымі і сціслымі пераказамі. Нельга пераказваць так, "як атрымаецца", камбінаваць падрабязны і сціслы пераказ.

***Навучанне творчым пераказам.*** У практыцы работы школы вядомы наступныя віды творчых пераказаў:

*а) пераказ са зменай асобы апавядальніка.* Гэта яшчэ не ў поўнай меры творчая праца, бо перабудова носіць граматычны характар. Неабходнасць памяняць асобу апавядальніка існуе часта (напрыклад, пры пераказе тэкстаў, напісанных ад першай асобы);

*б) пераказ ад імя аднаго з персанажаў.* Каб паспяхова справіцца з такім заданнем, вучань павінен увайсці ў ролю персанажа, зразумець яго ўзрост, характар, глянуць на падзеі яго вачыма;

*в) пераказ усяго тэксту або яго часткі з творчым дапаўненнем – з прыдуманымі эпізодамі ці дэталямі; працяг апавядання.* Творчыя дапаўненні могуць быць правільна зроблены толькі ў тым выпадку, калі вучні зразумелі змест апавядання

і добра ведаюць усе абставіны, у якіх праходзіць дзеянне. Вельмі асцярожна трэба прапаноўваць малодшым школьнікам прагназаваць лёсы герояў твора (гэта найлепш атрымліваецца тады, калі вучні працуюць з апавяданнем пра сваіх равеснікаў);

*г) інсцэніраванне апавядання.* Інсцэніраваць трэба тэксты, у якіх многа дыялогаў, параўнальна простыя абставіны. Пераходным этапам да інсцэніравання служыць чытанне па ролях. Пры чытанні па ролях, як ужо зазначалася раней, дзеці перадаюць толькі рэплікі персанажаў, а словы аўтара апускаюцца;

*д) слоўнае маляванне.* Настаўнік пытае, як дзеці ўяўляюць абставіны ў пэўны момант дзеяння. Раскажыце так, нібы гэта ўсё перад вашымі вачыма. Уявіце, што вам трэба намаляваць карціну да твора. Якія фарбы вы выкарыстаеце, каб намаляваць неба, зямлю?

## 3.4. Методыка працы над пісьмовым пераказам

***Пісьмовы пераказ як практыкаванне ў развіцці звязнага маўлення вучня.*** Пісьмовы пераказ з'яўляецца адным з актыўных відаў працы па развіцці звязнага маўлення малодшых школьнікаў. У пачатковай школе ўсе пісьмовыя пераказы носяць навучальны характар. Як і вусныя пераказы, яны могуць быць:

а) блізкімі да прачытанага тэксту;

б) сціслымі;

в) пераказамі са зменай формы і зместу (творчымі);

г) пераказамі з пашырэннем тэксту; д) пераказамі па аналогіі.

Часцей за ўсё сустракаюцца пераказы, блізкія да прачытанага ці праслуханага тэксту. З іх і трэба пачынаць навучанне.

***Паслядоўнасць навучання падрабязнаму пераказу; структура ўрокаў.*** Выдзяляюць некалькі этапаў навучання пераказам.

Раскрыем спачатку методыку працы над пісьмовым пераказам на *пачатковым* этапе.

На дошцы запісаны тэкст. Вучні чытаюць яго па адным сказе, гавораць пра каго і што даведаліся. Тэкст сціраецца. Настаўнік запісвае пытанні. Побач ён піша слова, якое трэба выкарыстаць пры адказе. Дзеці самастойна пішуць адказы на пытанні па парадку і правяраюць напісанае.

Паступова пытанні ўскладняюцца і патрабуюць дадаваць не адно, а два словы ці адказваць "сваімі словамі".

На гэтым этапе карысны практыкаванні на ўзнаўленне дэфармаванага тэксту па малюнках ці без іх, па пытаннях ці без пытанняў.

*На другім этапе* дзеці чытаюць тэкст на дошцы ці ўспрымаюць яго на слых. Настаўнік прапануе пераказаць тэкст моўчкі. Пасля настаўнік адкрывае запісаныя пытанні. Дзеці складаюць вусныя адказы. Далей ідзе арфаграфічная падрыхтоўка і самастойная праца.

*На трэцім этапе* дзеці вучацца вызначаць галоўную думку тэксту, дзяліць яго на часткі і складаць план. Прапануюцца тэксты-апісанні і тэксты з элементамі разважання, а таксама тэксты гістарычнага зместу.

Урок навучання пераказу на гэтым этапе будуецца па наступнай схеме.

*1. Паведамленне тэмы.* Тэма запісваецца на дошцы. Настаўнік гаворыць пра задачы працы на ўроку.

*2. Кароткая ўступная гутарка.* Характар і задачы ўступнай гутаркі такія ж, як і пры рабоце над мастацкім творам. Калі тэкст просты і зразумелы дзецям, то ўступная гутарка можа не праводзіцца, настаўнік толькі ўдакладняе тэму.

*3. Чытанне тэксту настаўнікам (адзін раз).* Чытанне настаўніка павінна быць выразным, ясным. Дапускаецца паўторнае чытанне, калі тэкст больш складаны.

*4. Кароткая гутарка па змесце прачытанага.* Настаўнік ставіць задачу высветліць, што самае галоўнае ў тэксце, звяртае ўвагу на тое, што пра галоўнае варта напісаць больш падрабязна. У час такой гутаркі вылучаюцца і запісваюцца на дошцы "карысныя" словы, а таксама тлумачацца ўсе незразумелыя моўныя адзінкі. Цяжкія ў арфаграфічных адносінах словы таксама запісваюцца.

*5. Складанне плана пераказу.* У метадычнай літаратуры рэкамендуецца наступная паслядоўнасць увядзення плана: спачатку настаўнік сам дае план пераказу ў выглядзе пытанняў, а пасля таго, як дзеці атрымалі пэўны навык, вядзецца калектыўнае складанне плана. Яго можна складаць:

а) у паслядоўнасці развіцця сюжэту;

б) спачатку вызначаецца галоўнае ў тэксце, а пасля задаецца пытанне: "Што было да гэтага і пасля гэтага?" Ставіцца задача пра галоўнае напісаць падрабязна, а пра ўсё астатняе – больш сцісла.

*6. Вусны пераказ вучнем прачытанага тэксту па складзеным плане ці паўторнае чытанне тэксту настаўнікам.* На нашу думку, другі шлях больш карысны. Паколькі тэкст-узор заўсёды большы па аб'ёме, чым самы падрабязны пераказ, вучні не змогуць завучыць яго на памяць. У гэтым выпадку не будзе трафарэтных пераказаў і поле самастойнай дзейнасці дзяцей будзе больш шырокім.

*7. Пісьмовы самастойны пераказ тэксту па плане (20–25 мінут).* У час пісьма вучні маюць права звяртацца да арфаграфічнага слоўніка, да настаўніка, але толькі ў тым выпадку, калі сустрэліся словы на не вывучанае пакуль што правіла.

*8. Самаправерка напісанага.* Кожны вучань перачытвае свой пераказ, робіць дапаўненні, папраўкі. Паколькі чарнавікамі дзеці не карыстаюцца, адзнака за акуратна зробленыя праўкі (калі яны павышаюць якасць напісанага) не зніжаецца.

Урок заканчваецца здачай сшыткаў на праверку.

Трэба прывучаць дзяцей не толькі выкладаць прачытанае, але і выказваць свае адносіны да падзеі, паводзін герояў. На першым этапе вучні робяць гэта з дапамогай настаўніка, а пасля – самастойна.

***Сціслы пісьмовы пераказ (пераказ са скарачэннем дэталяў).*** Першыя пераказы такога тыпу праводзяцца калектыўна пад кіраўніцтвам настаўніка. Тэкст маецца ў кожнага вучня ці запісаны на дошцы. Настаўнік дае заданне адзначыць сказы, якія выражаюць галоўную думку. Атрыманы тэкст перачытваецца і параўноўваецца з поўным.

***Сціслы пісьмовы пераказ з пашырэннем тэксту.*** Рыхтуючыся да ўрока, настаўнік скарачае тэкст, прапускаючы ў ім другараднае і пакідаючы галоўнае. Скарочаны такім чынам тэкст запісваецца на дошцы ці на асобных лістках. Ставіцца задача дапоўніць тэкст, каб атрымалася больш поўнае апавяданне. Дзеці запісваюць свае сказы ці дапаўняюць тыя, што маюцца: уводзяць эпітэты, параўнанні і г. д. Атрыманы тэкст зачытваецца, пасля чаго настаўнік агучвае для параўнання аўтарскі варыянт.

***Праверка і разбор пісьмовых пераказаў.*** Пры праверцы пісьмовых пераказаў настаўнік звяртае ўвагу:

– на паўнату перадачы ўсяго істотнага ў тэксце;
– на паслядоўнасць перадачы падзей;
– на правільнасць пабудовы сказаў;
– на ўдалы ці няўдалы выбар слоў;

– на граматычную і сінтаксічную граматнасць;

– на знешняе афармленне работы.

Аналіз пераказаў праводзіцца на наступным уроку ў класе. Ён павінен спалучацца з працай па навучанні рэдагаванню. Як ужо адзначалася, адмоўныя адзнакі па пераказе не ставяцца. Настаўнік мае права не ставіць невысокія станоўчыя адзнакі, калі для канкрэтнага вучня яны не будуць стымулам да працы.

## 3.5. Методыка напісання сачыненняў розных тыпаў

***Тыпы сачыненняў у пачатковай школе.*** Сачыненні ў пачатковай школе павінны заняць асаблівае месца і ў пэўнай меры падпарадкаваць сабе іншыя моўныя практыкаванні. Праца па навучанні сачыненням пачынаецца з першага класа і, чаргуючыся з працай па навучанні пераказу, праходзіць праз усе гады навучання ў пачатковай школе, паступова ўскладняючыся.

Сачыненні класіфікуюць па наступных крытэрыях:

*а) па ступені самастойнасці:* калектыўныя і індывідуальныя.

У другім класе і ў першым паўгоддзі трэцяга класа сачыненні часцей за ўсё складаюцца калектыўна, пад кіраўніцтвам настаўніка. Калектыўна складзеныя і апрацаваныя тэксты сачыненняў малодшыя школьнікі запісваюць у сшыткі. Паступова самастойнасць вучняў павялічваецца;

*б) па жанрах:* апавядальныя, апісальныя, сачыненні-разважанні;

*в) па стылі:* эмацыянальна-вобразныя (апісанне прыроды, з'яў, падзей), дзелавыя (запісы па назіраннях, справаздачы);

*г) па тэматычных групах:* прырода нашай Радзімы; праца; школа, сям'я, сябры і інш.;

*д) у залежнасці ад матэрыялу, які выкарыстоўваецца:* сачыненні па серыі карцін і адной карціне; сачыненні на аснове ўласных назіранняў дзяцей за з'явамі прыроды, грамадскага жыцця; сачыненні па літаратурным матэрыяле;

*е) па ўмовах выканання:* класныя, дамашнія, класна-дамашнія.

***Тэма сачынення і яе раскрыццё.*** Напісанне сачынення пачынаецца з выбару яго тэмы. Тэма і загаловак творчай працы супадаюць не заўсёды. Напрыклад, калі выбрана тэма "Першыя прыметы восені", то сачыненне можна назваць гэтаксама, але калі гэта будзе мастацкае апісанне, то загаловак лепш выбраць больш паэтычны, напрыклад : "Гляне жоўтым лістком з-пад зялёнай хусцінкі", "Па зямлі ступае восень". Чым шырэйшы загаловак, тым больш у сачыненнях агульных месцаў, штампаў, пералічэння агульнавядомага. Вучні прывыкаюць пісаць агульнымі фразамі, не абапіраючыся ні на вопыт, ні на канкрэтныя веды.

Малодшыя школьнікі не заўсёды ўмеюць вызначыць межы тэмы. Яны пішуць пра ўсё, што хоць у нейкай меры ў іх свядомасці з ёю звязана. Работа над тэмай – гэта ў першую чаргу адбор матэрыялу, выбар таго, што адносіцца да тэмы, і пазбаўленне ад ўсяго іншага.

Тэмамі сачыненняў павінна служыць найперш жывая рэчаіснасць, якую дзіця назірае, а таксама ўласная дзейнасць дзіцяці.

Тэма сачынення павінна быць раскрыта настолькі глыбока, наколькі гэта дазваляюць веды і ўзровень развіцця вучняў.

У працы над сачыненнем магчымы два шляхі:

*1. Тэма абагульняе матэрыял, якім запасліся вучні ў штодзённым жыцці, вучобе, працы.*

*2. Тэма пазначаецца, і матэрыял збіраецца да тэмы.*

Першы шлях найбольш блізкі да сапраўднай літаратурнай творчасці, бо пісьменнік ідзе ад вопыту жыцця. Непасрэдна перад пісьмом сачынення складаецца план. Ён просты, утрымлівае 3–5 пунктаў.

Калі настаўнік вырашыў ісці другім шляхам, ён пазначае план раскрыцця тэмы, арганізоўвае шырокую, іншы раз працяглую падрыхтоўку, каб вучыць назіраць, збіраць факты, супастаўляць іх, рабіць высновы. Непасрэдна перад напісаннем сачынення праводзіцца ўдакладненне раней складзенага плана.

Працуючы з мастацкімі тэкстамі на ўроку, вучні ўзбагачаюць слоўнікавы запас, ад якога, безумоўна, залежыць якасць сачыненняў. Аднак праца над слоўнікам не павінна зводзіцца да адбору "прыгожых" слоў. Лексічная адзінка, з'яўляючыся вобразным сродкам у адным кантэксце, можа згубіць сваю вобразнасць, калі яе перанесці ў іншы кантэкст.

***Методыка напісання сачыненняў розных тыпаў.*** Спачатку разгледзім *сачыненні па малюнку*. Першыя такія сачыненні бяруць свой пачатак у перыяд навучання грамаце і праводзяцца ў вуснай форме. Па сюжэтных малюнках буквара дзеці вучацца складаць сачыненні, карыстаючыся "чарадзейнымі словамі" "Калі?", "Дзе?", "Што?", "Як?". Названыя пытанні выступаюць у якасці своеасаблівага плана.

Методыка навучання першым пісьмовым сачыненням па малюнку наступная. Спачатку дзеці вольна (без пытанняў настаўніка) разглядаюць карціну і перадаюць яе змест. Заўважыўшы недакладнасці, настаўнік шляхам пытанняў удакладняе выказванні вучняў. Устанаўліваецца лагічная паслядоўнасць і сувязь падзей. Выбіраюцца патрэбныя словы і выразы. Дзецям на карціне даюцца імёны. На дошцы запісваюцца пытанні і адказы. Праводзіцца папярэджанне арфаграфічных памылак. Падбіраецца загаловак. Пасля гэтага адказы сціраюцца, а пытанні застаюцца. Вучні працуюць самастойна.

На наступных этапах праца ўскладняецца: пытанні запісваюцца без адказаў, ці адказ пададзены адным словам.

У трэцім і чацвёртым класах вучні пішуць сачыненні па калектыўна складзеным плане.

*Апавядальныя сачыненні па серыі малюнкаў* – гэта найбольш даступны дзецям від практыкаванняў па развіцці звязнага маўлення. Навучанне вусным сачыненням па серыі малюнкаў пачынаецца яшчэ ў букварны перыяд. Вучні разглядаюць малюнкі (калі малюнкі серыі разрэзаны, іх можна даць у адвольным парадку) і складаюць сказы. Кожны малюнак, такім чынам, уяўляе канкрэтны пункт плана сачынення.

Навучанне пісьмовым сачыненням па серыі малюнкаў на першым этапе праводзіцца ў наступным парадку. Спачатку настаўнік, не стрымліваючы ініцыятыву дзяцей, дае ім магчымасць выказацца. Сачыненні атрымліваюцца вялікімі, і дзеці не могуць запісаць іх поўнасцю. Пасля яны скарачаюцца: да кожнага малюнка па пытанні на дошцы складаецца і запісваецца адзін сказ, які перадае асноўную думку. Пасля таго як будуць запісаны ўсе адказы, яны перачытваюцца і сціраюцца. Падбіраецца загаловак. Вучні пішуць сачыненні па пытальным плане. Працу можна ўскладніць, прапанаваўшы запісаць сачыненне толькі па малюнках ці толькі па плане.

У трэцім і чацвёртым класах запісваецца па некалькі сказаў да кожнага малюнка па калектыўна складзеным плане, пададзеным загалоўкамі.

У пачатковай школе можна практыкаваць сачыненні па серыі малюнкаў на аснове апорных слоў, а таксама сачыненні па двух малюнках, аб'яднаных зместам (напрыклад, адзін і той жа пейзаж летам і восенню).

*Апісальныя сачыненні па карціне* праводзяцца звычайна ў 5–8 класах, але навучанне можна пачаць і ў пачатковай школе. Гэта самая складаная форма сачынення. Цяжкасць апісання заключаецца ў тым, што яно павінна ўтрымліваць у сабе элементы аналізу і ацэнкі, а ў дзяцей няма ведаў па мастацтвазнаўстве, невялікі жыццёвы вопыт.

У пачатковых класах, апісваючы карціну па пытаннях, вучні выяўляюць:

а) тэму (што бачаць на карціне);

б) кампазіцыю (пярэдні і задні план, размяшчэнне фігур і прадметаў);

в) дзеючых асоб (даецца іх апісанне);

г) дзеянне, сюжэт карціны (калі ён ёсць);

д) ідэйна-вобразны змест (у найбольш лёгкіх выпадках) і свае ўражанні.

Сачыненні па назіраннях і з уласнага вопыту праводзяцца ў пачатковых класах часцей за іншыя. Гэта могуць быць сачыненні на матэрыяле экскурсій, па назіраннях за прыродай і працай людзей.

Навучанне сачыненням дадзенага тыпу вядзецца ў наступным парадку.

На першым этапе настаўнік прапаноўвае пытанні. Вучні адказваюць адным сказам, паўтараючы словы пытання і дабаўляючы да іх адно слова, патрэбнае для адказу. Гэтае слова запісваецца побач з пытаннямі. Дзеці моўчкі чытаюць пытанні, а ўслых даюць толькі адказы. 1–2 вучні перадаюць тэкст цалкам. Праводзіцца арфаграфічная падрыхтоўка кожнага сказа. Пасля запісу ў сшытках сачыненні яшчэ раз перачытваюцца.

Калі дзеці навучацца пісаць такія сачыненні, настаўнік складае пытанні такім чынам, каб дзеці адказвалі на іх сваімі словамі.

Якое стаяла надвор'е?
Што мы рабілі на вуліцы?
Што раптам здарылася з караблікам?

Можа атрымацца наступны тэкст: *Стаяла добрае надвор'е. Мы пускалі караблікі. Раптам падуў вецер. Адзін караблік перакуліўся і патануў. Шкада карабліка.*

Вядомы айчынны метадыст М. Г. Яленскі прапануе ў першым і другім класах праводзіць толькі калектыўныя навучальныя сачыненні-мініяцюры накшталт творчых дыктантаў: дзеці пад кіраўніцтвам настаўніка складаюць варыянты сказаў, абмяркоўваюць іх, а пасля запісваюць пад дыктоўку.

*Сачыненні на аснове ўласнага вопыту* ў трэцім і чацвёртым класах можна правесці наступным чынам. Настаўнік выбірае тэму, цікавую для ўсіх. Адзін з вучняў расказвае пра зробленае, убачанае класам. Іншыя дапаўняюць яго. Складаецца план. Праводзіцца арфаграфічная падрыхтоўка. Кожны з вучняў да агульнага матэрыялу дадае свой (непасрэдны ўдзел у працы, уласныя ўражанні).

У трэцім і чацвёртым класах дзеці вучацца складаць сачыненні апісальнага характару. Так, напрыклад, пасля экскурсіі на рэчку ў працэсе гутаркі ўдакладняецца наступнае:

– Як называецца рака?
– У якім напрамку цячэ?
– Шырокая яна ці вузкая?
– Глыбокая або мелкая?
– Ці ходзяць па рацэ параходы?
– Што знаходзіцца на правым і левым берагах ракі?
– Ці ёсць у рэчцы рыба, якая?
– З якой мэтай хадзілі на рэчку?

Малодшыя школьнікі могуць таксама пісаць сачыненні па літаратурным матэрыяле. Можна выдзеліць некалькі тыпаў сачыненняў такога тыпу:

а) *сачыненне па пачатку.* Настаўнік дае свой пачатак, такі, каб атрымалася завязка ў развіцці сюжэту. Напрыклад: *Я са сваім сябрам ішоў у кіно. Было цёмна. Раптам мы заўважылі...* Ці яшчэ: *Быў красавік. Мы ішлі берагам рэчкі. Раптам...;*

б) *сачыненне па фабуле.* Настаўнік прапаноўвае фабулу (сюжэт). Напрыклад: *Дзеці знайшлі бусляня з перабітым крылом. Усё лета яны даглядалі птушку. У жніўні бусел развітаўся са сваімі выратавальнікамі.* Такая фабула выкарыстоўваецца як план сачынення. Вучні павінны дапоўніць фабулу новымі дэталямі, а іменна напісаць, куды хадзілі дзеці, з якой мэтай і г. д. Сачыненне па фабуле лагічна працягвае такі від пераказу, як пераказ з пашырэннем дэталяў;

*в) сачыненне па апорных словах (у некаторых крыніцах яго называюць пераказам).* Настаўнік піша на дошцы рад слоў, якія ўказваюць на развіццё падзей. Апорныя словы – гэта свайго роду план сачынення. Напрыклад: *юннаты, прышкольны агарод, памідоры, капуста, выстаўка, наведвальнікі, здзіўленне, газета.* Скласці апавяданне можна таксама на матэрыяле слоўнікавых слоў;

*г) сачыненне па аналогіі.* Яно можа праводзіцца ў вуснай і пісьмовай формах. Прыклад такой працы: перад тым, як напісаць сачыненне "Мая вёска", настаўнік знаёміць вучняў з аднатэмнымі сачыненнямі іх равеснікаў у перыядычным друку. Пераймаецца план такіх сачыненняў, лексіка, асобныя сінтаксічныя канструкцыі.

## 3.6. Навучанне дзяцей напісанню некаторых відаў прац дзелавога стылю

***Інтэрв'ю.*** Гэта адзін з найбольш складаных відаў пісьмовай працы. Уменне правільна і дакладна ставіць пытанні не менш важнае, чым аргументаваны і доказны адказ на іх. Канечне, вучні малодшых класаў не могуць весці з дарослымі дыялог "на роўных", уключаць падчас размовы дадатковыя пытанні. Іх задача зводзіцца да таго, каб атрыманы матэрыял быў цікавы многім людзям. Адказы суразмоўцаў могуць быць змешчаны ў насценным друку, выкарыстаны на ўроку літаратурнага чытання, сабраны ў асобнай папцы. Інтэрв'ю дзеці могуць браць як у равеснікаў, так і ў дарослых. Колькасць пытанняў невялікая. Магчымая і такая сітуацыя, калі на адно і тое ж пытанне адкажуць некалькі чалавек. Змест пытанняў павінен быць дакладны, арыгінальны, цікавы. Напрыклад: "З якім казачным героем ты хацеў бы сустрэцца?", "За які ўчынак табе было сорамна?", "Якія б жаданні ты загадаў, калі меў бы чароўную палачку?"

Без увагі юных карэспандэнтаў не павінны застацца школьныя лаўрэаты конкурсаў, чэмпіёны, паэты, пераможцы алімпіяд і г. д. Можна ўзяць інтэрв'ю ў настаўніцы, школьнага бібліятэкара, медсястры і інш.

***Нататкі (замалёўкі) ў газету.*** Многія вядомыя цяпер пісьменнікі пачыналі шлях у вялікую літаратуру з газетных нататак. Вучні пачатковых класаў знаёмяцца з нататкай на ўроку пазакласнага чытання, працуючы над матэрыяламі газеты "Раніца", часопісаў "Вясёлка" і "Бярозка". Трэба пераканаць іх у тым, што ад звычайнага сачынення нататка адрозніваецца вастрынёй пастаўленай праблемы, яна часта ўтрымлівае заклік, зварот, параду, прапанову, перасцярогу. Заклік часам заключаны ў самой назве нататкі: "Дапамагайце птушкам!", "Не забывайце казаць «дзякуй!»" і г. д. Нататка дасягне мэты, калі зацікавіць чытачоў, стане прадметам абмеркавання.

На адным з урокаў пазакласнага чытання дзеці вучацца пад кіраўніцтвам настаўніка складаць нататку на прапанаваную тэму. Вялікае значэнне ў працэсе гэтай працы надаецца рэдагаванню тэксту. Напісанне нататкі – выдатная магчымасць накіраваць намаганні дзяцей на выпрацоўку дакладнасці, выразнасці і лаканічнасці выказвання. Неабходна таксама практыкавацца на падобным уроку ў выкарыстанні эмацыянальна-экспрэсіўнай лексікі, клічных па інтанацыі сказаў, рытарычных пытанняў, зваротаў.

У свой час вучні пачатковых класаў зачытваліся "Лясной газетай" Віталія Біянкі. Думаецца, не пакіне яна абыякавымі і цяперашніх чытачоў. Абапіраючыся на матэрыял названага класічнага твора, настаўнік мае магчымасць вырашаць канкрэтныя літаратурна-творчыя задачы. У класнай сценгазеце ці рукапісным часопісе вучні выступаюць "ад імя" лісы, мядзведзя, воўка, вожыка, зязюлі, шпака, сарокі. Зыходзячы з характару вобраза-псеўданіма, дзеці расказваюць аб зменах у прыродзе і фантазіруюць, дзелячыся з чытачамі "сваімі" ўражаннямі, выбіраючы адпаведны зместу выказвання настрой.

***Пісьмы.*** Першыя пісьмы пішуцца на тэму, якая патрабуе калектыўнай працы. Гэта можа быць пісьмо аднагодкам сельскай (гарадской) школы, у якім расказваецца пра жыццё класа, пісьмо – падзяка шэфам за дапамогу ў правядзенні экскурсіі і інш. Паступова вучнямі ўсведамляецца прыкладная структура пісьма: прывітанне, адказ на зададзеныя ў папярэднім лісце пытанні, паведамленне пра самае цікавае, што адбылося за апошні час, пытанні да сябра па перапісцы, віншаванні і пажаданні. Надзвычай важна навучыць дзяцей правільна выбраць форму звароту, якая б адпавядала ўзросту адрасата, ступені сваяцкіх адносін з ім, сацыяльнаму становішчу і г. д. Адзначаныя вышэй асаблівасці трэба мець на ўвазе, калі пішуцца пажаданні і віншаванні. Нават самыя добрыя пажаданні не зацікавяць блізкага чалавека, калі будуць шаблоннымі, неарыгінальнымі па змесце. Распаўсюджаныя сёння паштоўкі з папярэдне складзеным тэкстам робяць не лепшую паслугу і выхоўваюць дрэнны густ у дзяцей і дарослых. Той, хто выказвае пажаданні, павінен

добра ведаць, чаго жадае сябар, чым ён цікавіцца, якія ў яго планы на бліжэйшы час. Нетактоўна нават з самымі шчырымі намерамі жадаць адрасату пазбавіцца тых недахопаў, пра якія ён і сам добра ведае: выправіць дрэнныя адзнакі, заняцца фізкультурай, займець прыгожую паставу і г. д.

У час школьных канікул дзеці могуць напісаць лісты настаўніку па яго просьбе. Такія прыклады добра вядомыя з гісторыі педагогікі: вучні пісалі лісты М. Ф. Бунакову, Ш. А. Аманашвілі і іншым вядомым педагогам. У сваіх пісьмах любімым настаўнікам дзеці бываюць асабліва шчырымі, дзеляцца тымі праблемамі, з якімі саромеліся звярнуцца да іх у класе. Як паказвае практыка, малодшыя школьнікі з цікавасцю ўспрымаюць лісты Якуба Коласа, Янкі Маўра, Васіля Віткі, адрасаваныя школьнікам, а таксама лісты вядомых людзей сваім дзецям. Вучні любяць пісаць лісты літаратурным героям. У маляўнічых канвертах прыходзяць у клас пасланні ад Васі Вясёлкіна, Лесавічка, ад лясных жыхароў. Калі дзеці пасля знаёмства з цікавай кнігай ці апавяданнем у "Вясёлцы" або ў "Бярозцы" захочуць напісаць ліст самому пісьменніку – гэта трэба толькі вітаць. Кожны сапраўдны творца зацікаўлены ў тым, каб яго чыталі, рады любой праяве зваротнай сувязі.

Дзецям цікава таксама, адкуль пішуць настаўніку былыя вучні, пісьмы якіх вядомых у краіне людзей ён захоўвае. Шчырае і даверлівае слова педагога набліжае яго да дзяцей, падахвочваючы і дзяцей, і яго самога да ўзаемнай адкрытасці ў выяўленні думак і пачуццяў.

# ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Практычныя занятკі № 1. Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення

1. Тэарэтычныя асновы методыкі развіцця мовы вучняў.
2. Асноўныя прынцыпы методыкі развіцця мовы малодшых школьнікаў.
3. Асноўныя патрабаванні да маўлення вучняў.
4. Прынцыповыя адрозненні вуснай і пісьмовай мовы вучняў.

### Літаратура


1. Амонашвили, Ш. А. Личностно-гуманная основа педагогического процесса / Ш. А. Амонашвили. – Минск : Университетское, 1990. – С. 363 – 364.

2. Варановіч, З. Б. Методыка выкладання беларускай мовы / З. Б. Варановіч. – Мінск, 1985. – С. 119–128.

3. Гребенченко, Л. В. Виды заданий по формированию связной речи / Л. В. Гребененко // Нач. шк. – 2001. – № 9. – С. 100–102.

4. Лукашук, М. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / М. П. Лукашук. – Мінск : Выш. шк., 1980. – С. 6–29.

5. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / Я. М. Івашуціч [і інш.] ; пад. рэд. А. П. Шанько. – Мінск : Выш. шк., 1986.

6. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых классах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад. рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

7. Падгайскі, Л. П. Вывучэнне беларускай мовы ў пачатковых класах / Л. П. Падгайскі. – Мінск : Народ. асвета, 1975. – С. 194–222.

8. Сянкевіч, М. І. Курс лекцый па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2020.

9. Шпунтов, А. И. Обучение слушанию на уроках русского языка / А. И. Шпунтов // Нач. шк. – 1995. – № 2.

10. Юртаев, С. В. Принципы и методы развития речи/ С. В. Юртагаев // Нач. шк. – 2004. – № 9. – С. 37–42.

## Практычныя занятки № 2. Напрамкі развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў

1. Асноўныя напрамкі ў фарміраванні культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў

***Заданне:** закансектаваць адпаведны матэрыял з "Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі".

2. Арфаэпічныя памылкі: прычыны, папярэджанне і пераадоленне.

3. Напрамкі ў слоўнікавай рабоце; слоўнікавыя практыкаванні.

4. Развіццё мовы вучняў пры вывучэнні словазлучэнняў і сказаў.

5. Культура моўных зносін. Удасканальванне навыкаў аўдзіравання.

### Літаратура


1. Лукашук, М. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / М. П. Лукашук. – Мінск : Выш. шк., 1980. – С. 32–68.

2. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых классах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад. рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

3. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / Я. М. Івашуціч [і інш.] ; пад. рэд. А. П. Шанько. – Мінск : Выш. шк., 1986.

4. Праграмы на 2020–2021 навучальны год для школ з беларускай (рускай) мовай навучання.

5. Протчанка, В.У. Навучанне пераказу ў пачатковай школе / В. У. Протчанка, Я. М. Лаўрэль. – Мінск : Оракул, 1995. – 320 с.

6. Падгайскі, Л. П. Вывучэнне беларускай мовы ў пачатковых класах / Л. П. Падгайскі. – Мінск : Народ. асвета, 1975. – С. 223–233.

7. Падгайскі, Л. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / Л. П. Падгайскі, Н. Івашуціч. – Мінск, 1979.

8. Сянкевіч, М. І. Лінгваметадычныя і літаратуразнаўчыя асновы асэнсавання і аналізу мастацкага твора малодшымі школьнікамі / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ. 2005.

9. Сянкевіч, М. І. Курс лекцый па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2020.

## Дадатковая літаратура

1. Бязручка, А. Р. Інтанацыя – паказчык выразнага маўлення / А. Р. Бязручка // Пачатк. шк. – 2000. – № 2.

2. Какора, А. І. Прыёмы і формы ўзбагачэння слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў / А. І. Какора // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіц. сад, шк. – 2003. – № 1.

3. Лабачэня, Г. Я. Развіццё звязнай пісьмовай мовы вучняў/ Г. Я. Лабачэня // Пачатк. шк. – 2003.– № 3.

4. Шавель, В. М. Лагічны націск / В. М. Шавель // Пачатк. шк. – 2002. – № 2.

## Практычныя заняткі № 3. Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў

1. Звязнае маўленне; віды практыкаванняў у звязным маўленні.

2. Методыка вывучэння тэмы "Тэкст" у пачатковых класах:

а) тэма і загаловак тэксту;

б) структура тэкстаў розных тыпаў;

в) праграмныя патрабаванні да ведаў і ўменняў вучняў;

3. Агульныя патрабаванні да тэкстаў, якія пераказваюцца, і да пераказаў.

4. Навучанне малодшых школьнікаў падрабязнаму, сцісламу, выбарачнаму і творчаму пераказам.

**ЗАДАННІ (у падгрупах):**

***1. Складзіце план-канспект падрабязнага пісьмовага пераказу на аснове прыведзенага ніжэй тэксту***

У маленькіх вожыкаў прапала маці і яны засталіся адны. Калючыя клубочкі гінулі. Яны былі галодныя. Магла здарыцца бяда.

Акрамя вожыкаў, у доме жыла кошка Мурка. Акурат у гэты час у Мурکі нарадзіліся каценяты, і клапатлівая маці карміла іх малаком. Аднойчы дзеці заўважылі, як кошка падышла да маленькіх сірат і хацела іх пакарміць. Але вожыкі калоліся.

Пеця і Васілёк доўга думалі, як дапамагчы калючым камячкам. І прыдумалі. Яны загарнулі малых у анучку. Цяпер зверкі не калоліся. Мурка пакарміла вожыкаў малаком. Зверкі былі выратаваны.

*2. Скласці план-канспект выбарачнага пісьмовага пераказу “Апісанне знешняга выгляду андатры” на аснове прыведзенага ніжэй тэксту*

## АНДАТРА

Андатра агледзела байдарку і паплыла вакол яе.

Мне добра відаць, як спрытна яна плыве. Кароткія пярэднія лапкі прыціснуты да грудзей. А вяслуе вялікімі заднімі лапамі з перапонкамі паміж пальцаў. Здаецца, нібы вакол байдаркі плавае маленькі бабёр. Але ў бабра хвост шырокі, тоўсты і пляскаты, пакрыты дробнай луской. У андатры – вузкі, сціснуты з бакоў. Ён пастаўлены да паверхні вады рабром, і андатра карыстаецца хвастом і як вяслом, і як рулём.

Я цярпліва чакаў.

Зрабіўшы вакол байдаркі круг, андатра нырнула і апынулася пад вадою каля карчажыны.

З вады высунуўся нос, потым паказалася круглая мокрая галава. Праз хвіліну яна была ўжо на лопасці весла. Вочкі звярка круглыя і бліскучыя, дапытліва паглядаюць на мяне з-пад мокрай карычневай шэрсці. Носік увесь час безупынку варушыцца, а доўгія рэдкія вусы тапырацца. Велічынёй звярок быў з маладую кошку.

***3. Скласці план-канспект творчага пісьмовага пераказу (пашырэнне зместу) на аснове прыведзенага ніжэй тэксту***

## ЛЯЦІ, ВЕРАБЕЙКА

Праз адчыненае акно ў пакой заляцеў верабей. Андрэйка не захацеў выпускаць птушку. Ён старанна даглядаў вераб'я.

Праз некалькі дзён Андрэйка нацешыўся вераб'ём, але выпускаць з кватэры ўсё роўна не хацеў.

Здарылася так, што хлопчык прастудзіўся. Мама забараніла яму гуляць на вуліцы. Андрэйка зноў стаў старанна даглядаць птушку. Але верабей не хацеў забаўляцца з андрэйкам. Не чырыкаў. Заб'ецца ў куток і сядзіць моўчкі.

Прыляцела чародка вераб'ёў і села на галлё. Пачуў іх верабей і зашчабятаў. Хлопчык адчыніў акно і выпусціў птушку на волю.

***4. Скласці план-канспект сціслага пераказу на аснове прыведзенага ніжэй тэксту***

## ПРЫЛЁТ ГУСЕЙ

Дзядзька ўзяў Міхася на паляванне. Адвячорак выдаўся ціхі. Неба было зацягнута лёгкімі хмурынкамі. Далягляд кранула сiняватая смуга. Булькат палявога ручайка далёка разносіўся ў наваколлі. Схаваліся ў лазовым кусце. Дзядзька прыладзіў стрэльбу. Нейкі час сядзелі моўчкі. Потым яны ўбачылі гусіную чараду. Дзядзька толькі чакаў гэтага. Ён мацней прыцiснуў прыклад да пляча. Гусі стомлена ўзмахвалі крыламі.

Міхась залюбаваўся важаком. Гэта быў шыракакрылы гусак. Хлопчык ціхенька тузануў дзядзьку за куртку і зашаптаў: "Не трэба, не трэба".

Гусі селі на жытнёвае поле. Лапатанне крылаў, плёскат вады на нейкі час запоўнілі наваколле. Потым усё сціхла.

Паляўнічыя выбраліся з лазняку і пайшлі дамоў.

# Літаратура


1. Лукашук, М. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / М. П. Лукашук. – Мінск : Выш. шк., 1980. – С. 32–68.

2. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых классах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад. рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

3. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / Я. М. Івашуціч [і інш.]; пад. рэд. А. П. Шанько. – Мінск : Выш. шк., 1986.

4. Праграмы на 2020–2021 навучальны год для школ з беларускай (рускай) мовай навучання.

5. Падгайскі, Л. П. Вывучэнне беларускай мовы ў пачатковых класах. / Л. П. Падгайскі. – Мінск : Народ. асвета, 1975. – С. 233–249.

6. Падгайскі, Л. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / Л. П. Падгайскі, Н. Івашуціч. – Мінск, 1979.

7. Протчанка, В. У. Навучанне пераказу ў пачатковай школе / В. У. Протчанка, Я. М. Лаўрэль. – Мінск : Оракул, 1995. – 320 с.

8. Сянкевіч, М. І. Лінгваметадычныя і літаратуразнаўчыя асновы асэнсавання і аналізу мастацкага твора малодшымі школьнікамі / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2005. – 132 с.

9. Сянкевіч, М. І. Курс лекцый па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2020.

10. Яленскі, М. Г. Навучанне роднай мове на аснове суразмоўніцтва / М. Г. Яленскі // Пачатк. шк. – 2000. – № 7–10.


## Дадатковая літаратура


1. Бакулина, Г. А. О работе над изложением на уроках русского языка / Г. А. Бакулина // Нач. шк. – 2011. – № 6.

2. Ковалёва, Л. Н. Обучение младших школьников письму сочинений и изложений / Л. Н. Кавалёва // Нач. шк. – 1991. – № 12. – С. 16–20.

3. Полухина, Е. А. Активное слушанье в обучении изложению / Е. А. Полухина // Нач. шк. – 2002. – № 2. – С. 23–24.

4. Сянкевіч, М. І. Дзіцячая літаратурная творчасць: матывы, значымасць, ацэнка/ М. І. Сянкевіч // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіц. сад, шк. – 2004. – № 1. – С. 10–12.

5. Тивикова, С. К. Творческое изложение на основе метода прогнозирования / С. К. Тивакова // Нач. шк. – 2004. – № 2. –С. 61–68.

6. Федаровіч, Г. М. Фарміраванне маўленчых уменняў у вучняў 3 класа / Г. М. Федаровіч // Пачатк. шк. – 2008. – № 5. – С. 46–49.

7. Черемисина, Н. А. Как подготовить сжатое изложение текста / Н. А. Черемисина // Нач. шк. – 2009. – № 1.

## Практычныя занятκі № 4–5. Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення

1. Сачыненне як творчае практыкаванне; значэнне сачыненняў у выхаванні вучняў, развіцці іх маўлення і мыслення.
2. Віды вусных і пісьмовых сачыненняў.
3. Тэма сачынення і яе раскрыццё.
4. Падрыхтоўка да сачынення; складанне плана сачынення.
5. Методыка навучання сачыненням розных тыпаў:

а) сачыненне па карціне;
б) сачыненне па серыі малюнкаў;
в) сачыненні на аснове літаратурнага матэрыялу;
г) сачыненні на аснове назіранняў, уражанняў, асабістага вопыту;
д) сачыненні на аснове творчага ўяўлення.

6. Навучанне малодшых школьнікаў пісьмовым выказванням дзелавога і публіцыстычнага стылю (пісьмы, інтэрв'ю, водгукі на прачытаную кнігу, замалёўкі ў газету)

**Заданне:** Складзі план-канспект урока (у падгрупах), на якім вучні будуць вучыцца пісаць сачыненні:

а) па карціне;
б) на аснове назіранняў і асабістага вопыту;
в) па літаратурным матэрыяле.

### Літаратура

1. Лукашук, М. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / М. П. Лукашук. – Мінск : Выш. шк., 1980. – С. 32–68.

2. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых классах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад. рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

3. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / Я. М. Івашуціч [і інш.]; пад. рэд. А. П. Шанько. – Мінск : Выш. шк., 1986.

4. Праграмы на 2020–2021 навучальны год для школ з беларускай (рускай) мовай навучання.

5. Падгайскі, Л. П. Вывучэнне беларускай мовы ў пачатковых класах. – Мінск : Народ. асвета, 1975. – С. 233–249.

6. Падгайскі, Л. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / Л. П. Падгайскі, Н. Івашуціч. – Мінск, 1979.

7. Протчанка, В. У. Навучанне пераказу ў пачатковай школе / В. У. Протчанка, Я. М. Лаўрэль. – Мінск : Оракул, 1995. – 320 с.

8. Сянкевіч, М. І. Лінгваметадычныя і літаратуразнаўчыя асновы асэнсавання і аналізу мастацкага твора малодшымі школьнікамі / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2005. – 132 с.

9. Сянкевіч, М. І. Напісанне сачыненняў па серыі сюжэтных малюнкаў / М. І. Сянкевіч // Пачатк. шк. – 2008. – № 3. – С. 28–32.

10. Сянкевіч, М. І. Курс лекцый па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2020.

11. Яленскі, М. Г. Навучанне роднай мове на аснове суразмоўніцтва / М. Г. Яленскі // Пачатк. шк. – 2000. – № 7–10.

## Дадатковая літаратура

1. Бондаренко, А. А. Сочинение с ошибками: о редактировании текста в начальной школе / А. А. Бондаренко // Нач. шк. – 2009. – № 4.

2. Гоголева, И. И. Сочинение как средство общего развития учащихся / И. И. Гоголева // Нач. шк. – 2010. – № 1.

3. Ерохина, Е. Л. Ура! Опять сочинение / Е. Л. Ерохина // Нач. шк.: плюс До и После. – 2004. – № 2. – С. 31–36.

4. Ковалева, Л. Н. Обучение младших школьников письму сочинений и изложений / Л. Н. Ковалева // Нач. шк. – 1991. – № 12. – С. 16–20.

5. Лагун, Н. Е. Учим писать сочинение / Н. Е. Лагун // Пачатк. шк. – 2009. – № 8. – С. 41–44.

6. Лукьянчикова, Л. Н. Уроки обучающего сочинения в начальной школе/ Л. Н. Лукьянчикова // Нач. шк. – 2000. – № 12. – С. 40–43.

7. Майская, А. З. Методические рекомендации к написанию сочинения / А. З. Майская // Нач. шк. – 2001. -№ 9. – С. 40–44.

8. Перхорович, К. И. Подготовка к написанию сочинений / К. И. Перхорович // Пачатк. шк. – 2001. – № 4. – С. 27–28.

9. Роляк, Л. Н. Учимся писать сочинение по картине / Л. Н. Роляк // Нач. шк. – 2001. – № 5. – С. 96-98.

10. Сянкевіч, М. І. Дзіцячая літаратурная творчасць: матывы, значымасць, ацэнка / М. І. Сянкевіч // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіц. сад, шк. – 2004. – № 1. – С. 10–12.

11. Федаровіч, Г. М. Фарміраванне маўленчых уменняў у вучняў 3 класа / Г. М. Федаровіч // Пачатк. шк. – 2008. – № 5. – С. 46–49.

## Кіруемая самастойная праца

**Тэма:** ***Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў***

1. Заканспектаваць з «Метадычных рэкамедацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі» дадатак 2 «Колькасць і аб'ём навучальных работ па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі».

2. Заканспектаваць з «Ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» ў агульнаадукацыйных установах з беларускай (рускай) мовай навучання» раздзелы «Ацэнка маўленча-камунікатыўных уменняў і навыкаў» і «Ацэньванне пераказаў і сачыненняў».

3. Прааналізуйце вучнёўскія сачыненні «Прыгожы лісток», «Восеньскі букет», «Грыбнікі» і ацаніце іх з улікам зместу і граматнасці.

### Літаратура

1. Бондаренко, А. А. Сочинение с ошибками: о редактировании текста в начальной школе / А. А. Бондаренко // Нач. шк. – 2009. – № 4.

2. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых классах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад. рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

3. Сянкевіч, М. І. Курс лекцый па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2020.

## Кантрольны тэст

### Тэст

## Кантрольная праца

### па раздзеле «Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў»

1. Прааналізуйце практыкавані ў звязным маўленні – пераказы ў 2–3 класах, асобна выпішыце паняцці і практыкаванні ў 4 класе па плане: а) старонка, № практыкавання; б) заданне; в) выхаваўчыя магчымасці тэксту.

2. Падбярыце тэкст, які даступны вучням пачатковых класаў і адказвае патрабаванням да тэксту для пераказу, складзіце моўны каментарый да тэксту.

3. Выберыце карціну для 3 класа, складзіце канспект урока над сачыненнем па карціне.

4. Падбярыце прыклады тэкстаў з ланцужковай і паралельнай пабудовай, прызначаныя для вучняў пачатковых класаў. У кожным тэксце правядзіце аналіз сродкаў сувязі паміж сказамі.

Распрацуйце тэкставыя практыкаванні для працы з падабранымі тэкстамі.

5. Складзіце стылістычна-тэкставае практыкаванне для вучняў 4 класа.

### Літаратура

1. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых классах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад. рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

2. Сянкевіч, М. І. Курс лекцый па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2020.

## Пытанні да экзамену

1. Прынцыповыя адрозненні вуснай і пісьмовай мовы вучняў.
2. Мэты, задачы і напрамкі працы па развіцці маўлення малодшых школьнікаў; патрабаванні да вуснага і пісьмовага маўлення вучняў.
3. Арфаэпічныя памылкі ў мове вучняў, прычыны іх узнікнення і прыёмы выпраўлення.
4. Змест і задачы лексічнай працы на ўроках беларускай мовы; методыка правядзення слоўнікава-лагічных, слоўнікава-граматычных і слоўнікава-стылістычных практыкаванняў.
5. Азнаямленне малодшых школьнікаў з сінонімамі, антонімамі і мнагазначнымі словамі.
6. Работа над словазлучэннем і сказам як аснова развіцця звязнага маўлення малодшых школьнікаў.
7. Задачы і змест развіцця звязнага маўлення вучняў; тэкст, яго тэма, структура, галоўная думка, загаловак.
8. Методыка навучання вусным пераказам розных тыпаў.
9. Паслядоўнасць навучання пісьмовым пераказам; методыка правядзення пісьмовых пераказаў розных тыпаў.
10. Сачыненне як асноўны від працы па развіцці звязнай мовы вучняў; методыка правядзення сачыненняў па малюнку і серыі серыі малюнкаў.
11. Методыка правядзення сачыненняў паводле назіранняў за прыродай, на аснове атрыманых уражанняў і жыццёвага вопыту і па літаратурным матэрыяле.
12. Навучанне малодшых школьнікаў напісанню творчых прац дзелавога стылю (пісьмы, інтэрв'ю, замалёўкі ў газету і інш.).

# ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## Змест вучэбнага матэрыялу

## МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

### Тэма 1. Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення

Паняцці "мова", "маўленне", "мысленне" Узаемаабумоўленасць і ўзаемасувязь мовы, маўлення, мыслення. Віды маўлення: унутранае, знешняе, вуснае, пісьмовае, маналагічнае, дыялагічнае.

Маўленчая дзейнасць. Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне, пісьмо. Мэты і змест працы па развіцці маўлення малодшых школьнікаў. Прынцыпы методыкі развіцця маўлення. Задачы развіцця маўлення вучняў. Патрабаванні да вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў. Умовы паспяховага развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў.

### Тэма 2. Напрамкі развіцця маўлення вучняў пачатковых класах

Выпрацоўка навыкаў літаратурнага вымаўлення. Недахопы вуснага маўлення школьнікаў, іх прычыны. Кірункі працы па засваенні вучнямі арфаэпічных нормаў. Прыёмы работы па выпрацоўцы выразнасці вуснага маўлення школьнікаў.

Удакладненне, узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў. Задачы, змест і методыка лексічнай працы на ўроках мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах. Прыёмы семантызацыі слоў. Слоўнікава-семантычная і слоўнікава-стылістычная праца на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання. Гульні і займальныя практыкаванні са словамі на ўроках мовы і літаратурнага чытання.

Граматычны ўзровень працы па развіцці маўлення. Словазлучэнне і сказ – аснова развіцця звязнага маўлення малодшых школьнікаў. Словаформа як адзінка мовы і маўлення. Асаблівасці засваення школьнікамі граматычных формаў. Задачы і змест

працы над граматычнай формай слова ў аспеце развіцця маўлення. Тыпалогія практыкаванняў: практыкаванні, накіраваныя на засваенне вучнямі абмежаванняў ва ўтварэнні і спалучальнасці граматычных формаў, на ўсведамленне сэнсавых і выяўленчых магчымасцяў граматычных формаў, на развіццё ўменняў мэтазгодна выкарыстоўваць граматычныя формы ў звязным маўленні.

Фарміраванне камунікатыўных уменняў – асноўны змест працы па развіцці звязнага маўлення.

## Тэма 3. Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў

Задачы, змест працы па развіцці звязнага маўлення. Прапедэўтычныя лінгвістычныя веды, якія павінны набыць вучні пачатковых класаў: паняцце пра тэкст, тэму, структуру і галоўную думку выказвання.

Выпрацоўка ўмення падбіраць да выказвання загалоўкі, вызначаць тып тэксту (апісанне, апавяданне, разважанне), яго структуру, назапашваць фактычны матэрыял да творчых прац розных відаў.

Пераказ як від працы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Віды пераказаў, агульныя патрабаванні да вусных і пісьмовых пераказаў. Асаблівасці працы над падрабязным, сціслым, выбарачным і творчым пераказам.

Лексічная, граматычная, арфаграфічная і пунктуацыйная работа пры падрыхтоўцы пераказаў, папярэджанне памылак. Структура ўрока напісання пераказу. Напісанне і праверка пераказаў вучнямі.

Сачыненне як від працы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Віды сачыненняў па крыніцах выкарыстоўваемага матэрыялу: па асабістых назіраннях і ўражаннях, па ўласным вопыце, па матэрыялах экскурсій, па прачытаных творах, па сюжэтных малюнках і серыях малюнкаў, па праглядажаных фільмах, спектаклях, тэлеперадачах. Сачыненні з выкарыстаннем матэрыялаў з розных крыніц.

Віды сачыненняў па тыпах тэкстаў: апавяданне, апісанне, разважанне, сачыненні змешанага тыпу. Разнавіднасці сачыненняў (калектыўныя і індывідуальныя) у

залежнасці ад ступені ўдзелу настаўніка і класа ў іх падрыхтоўцы. Сачыненні-мініяцюры, іх асаблівасці і месца ў сістэме працы па развіцці звязнага маўлення вучняў.

Методыка работы па падрыхтоўцы і напісанні сачыненняў: збор матэрыялу, яго сістэматызацыя і абагульненне, вызначэнне зместу будучага выказвання, складанне плана. Лексічная, граматычная, арфаграфічная і пунктуацыйная работа пры падрыхтоўцы сачынення, папярэджанне памылак. Структура ўрока напісання сачынення.

Навучанне малодшых школьнікаў напісанню некаторых відаў прац дзелавога стылю. Інтэрв'ю. Нататкі (замалёўкі) у газету. Пісьмы.

Праверка вучнёўскіх пісьмовых творчых прац. Тыпы памылак, іх выпраўленне, улік і класіфікацыя, прыёмы ліквідацыі. Арганізацыя працы над памылкамі. Нормы ацэнкі творчых прац.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| | **Тэмы** | **Усяго гадзін** | **Лекцыі** | **Практычныя** | **КСП** |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення | **4** | 2 | 2 | |
| 2. | Напрамкі развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў | **4** | 2 | 2 | |
| 3. | Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў | **12** | 4 | 6 | 2 |
| | **УСЯГО** | **20** | **8** | **10** | **2** |

## Спіс выкарыстанай літаратуры

### АСНОЎНАЯ

1. Амонашвили, Ш. А. Личностно-гуманная основа педагогического процесса / Ш. А. Амонашвили. – Минск : Университетское, 1990. – С. 363 – 364.

2. Верашчака, Г. І. Развіццё маўленчай дзейнасці першакласнікаў (дыдактычны матэрыял да асобных старонак буквара) / Г. І. Верашчака, Г. М. Федаровіч. – Мінск : Пачатк. шк., 2007. – 292 с.

3. Вучэбны праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання: 1 клас / М-адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019.

4. Грабчикова, Е. С. Методика работы по развитию речи во 2–4 классах : пособие для учителей общеобразовательных учреждений с русским языком обучения / Е. С. Грабчикова. – Минск, 2010.

5. Канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская мова". I ступень агульнай сярэдняй адукацыі (для агульнаадукацыйных устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання) // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіц. сад, шк. – 2009. – № 7. – С. 6–10.

6. Лукашук, М. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / М. П. Лукашук. – Мінск : Выш. шк., 1980. – 118 с.

7. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад. рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

8. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / Я. М. Івашуціч [і інш.] ; пад. рэд. А. П. Шанько. – Мінск : Выш. шк., 1986.

9. Падгайскі, Л. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / Л. П. Падгайскі, Я. М. Івашуціч. – Мінск : Нар. асвета, 1979. – 102 с.

10. Протчанка, В. У. Навучанне пераказу ў пачатковай школе : метад. дапам. для настаўнікаў 2 – 4 кл. / В. У. Протчанка, Я. М. Лаўрэль. – Мінск : Аракул, 1995. – 319 с.

11. Сянкевіч, М. І. Напісанне сачыненняў па серыі сюжэтных малюнкаў / М. І. Сянкевіч // Пачатк. шк. – 2008. – № 3. – С. 28–32.
12. Сянкевіч, М. І. Углядацца, здзіўляцца, тварыць: развіццё творчых літаратурных здольнасцей малодшых школьнікаў : дапаможнік / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2018. – 68 с.
13. Учебные программы для 1–4 классов учреждений общего среднего образования с русским языком обучения. – Минск : НИО, 2019.
14. Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання” для спецыяльнасці 1-01 02 01 “Пачатковая адукацыя” / скл. В. І. Свірыдзенка. – Мінск : БДПУ, 2015.
15. Федаровіч, Г. М. Змест і формы арганізацыі маўленчай дзейнасці першакласнікаў / Г. М. Федаровіч // Пачатк. шк. – 2006. – № 5.
16. Чухрова, Л. В. Слова роднае, жывое, трапяткое: Работа над словам у перыяд навучання грамаце / Л. В.Чухрова // Пачатк. шк. – 1994. – № 7–12; 1995. – № 2–3.
17. Яленскі, М. Г. Навучанне роднай мове на аснове суразмоўніцтва / М. Г. Яленскі // Пачатк. шк. – 2000. – № 7–10.
18. Яленскі, М. Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе / М. Г. Яленскі. – Мінск, 2002.

## ДАДАТКОВАЯ

1. Архипова, Е. В. Об уроке развития речи в начальной школе / Е. В. Архипова // Нач. шк. – 2000. – № 4. – С. 35–39.
2. Асташов, Н. А. Исправление и предупреждение лексических недочетов в сочинении / Н. А. Асташов // Нач. шк. – 1983. – № 9.
3. Вислобокова-Эмская, Н. С. Работа с текстом на уроках русского языка в начальной школе / Н. С. Вислобокова-Эмская. – Минск, 2006.
4. Глизерина, Н. Д. Особенности изучения речеведческих понятий на уроках грамматики в начальной школе / Н. Д. Глизерина // Нач. шк. – 2015. – № 9. – С. 49.

5. Зиновьева, Т. И. Звуковая сторона речи и произносительная культура / Т. И. Зиновьева // Нач. шк. – 2014. – № 7. – С. 95–97.
6. Катонова, Е. М. Развитие речи: старые и новые взгляды на проблему / Е. М. Катонова // Пачатк. шк. – 2002. – № 9.
7. Ладыженская, Т. А. Речь. Речь. Речь / Т. А. Ладыженская. – М., 1995.
8. Ладыженская, Т. А. Методика развития речи на уроках русского языка / Т. А. Ладыженская. – М. : Просвещение, 2006.
9. Майская, А. З. Методические рекомендации к написанию сочинений / А. З. Майская // Нач. шк. – 2001. – № 9. – С. 40–44.
10. Матевосян, И. С. Обучение младших школьников рассуждению / И. С. Матевосян // Нач. шк. плюс до и после. – 2007. – С. 35–38.
11. Перцева, Н. К. О причинах ошибок младших школьников при конструировании и анализе предложений / Н. К. Перцева // Нач. шк. – 2010. – № 11.
12. Политова, Н. И. Современные подходы к решению практических задач по развитию речи младших школьников / Н. И. Полипова / Нач. шк.: плюс минус. – 2002. – № 4.
13. Политова, Н. И. Развитие речи учащихся начальных классов на уроках русского языка : пособие / Н. И. Политова. – М. : Просвещение, 2001. – 191 с.
14. Рензакова, Е. М. Использование методики скороговорения для развития речи младших школьников / Е. М. Рензакова // Нач. шк. – 2000. – № 11.
15. Роляк, Л. Н. Учимся писать сочинение по картине / Л. Н. Роляк // Нач. шк. – 2001. – № 5.
16. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры вучняў IV класа шляхам асваення метапрадметных вынікаў навучання беларускай мове / В. І. Свірыдзенка // Пачатк. шк. – 2017. – № 8.
17. Целикова, М. П. Занимательный материал по синтаксису простого предложения как средство развития речи младших школьников / М. П. Целикова // Нач. шк. – 2005. – № 11.

## Тэматыка курсавых прац

1. Навучанне малодшых школьнікаў беларускаму маўленчаму этыкету на ўроках беларускай мовы.

2. Фарміраванне маўленчай культуры вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўмовах білінгвізму.

3. Фарміраванне камунікатыўных якасцей маўлення (багацця, выразнасці, дакладнасці) малодшых школьнікаў у працэсе вывучэння лексікі.

4. Развіццё звязнага маўлення вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі на ўроках беларускай мовы.

5. Фарміраванне ў малодшых школьнікаў кампанентаў маўленчай дзейнасці.

6. Навучанне малодшых школьнікаў стварэнню выказванняў у жанры пісьма (загадкі, апавядання і інш.).

7. Выкарыстанне творчых прац як сродку развіцця маўлення вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

8. Развіццё ўменняў звязнага пісьмовага маўлення малодшых школьнікаў пры працы над пераказам.

9. Гульня як сродак развіцця маўлення вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

10. Методыка працы па папярэджванні і выпраўленні памылак пры напісанні малодшымі школьнікамі пераказу.

11. Фарміраванне маўленчых уменняў малодшых школьнікаў у працэсе навучанню пісьму сачыненняў.

12. Выкарыстанне інтэлект-карт у працы па развіцці маўлення вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

13. Дыялог як сродак развіцця звязнага маўлення малодшых шкорльнікаў на ўроках беларускай мовы.

14. Развіццё звязнага маўлення малодшых школьнікаў у працэсе працы над тэкстам (на матэрыяле 3 класа).

15. Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай мовы для развіцця маўлення малодшых школьнікаў.

16. Развіццё звязнага маўлення малодшых школьнікаў у працэсе працы над сачыненнем-апісаннем.

17. Маўленчыя гульні як сродак развіцця звязнага вуснага маўлення малодшых школьнікаў.

18. Развіццё звязнага маўлення малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы праз працу са сказам.

19. Навучанне сціcламу пераказу як сродак развіцця лагічнага мыслення малодшых школьнікаў.

20. Развіццё маўлення вучняў пры вывучэнні тэмы «Назоўнік» у 3 класе.

21. Выкарыстанне прыёмаў ТРВЗ-педагогікі на ўроках развіцця маўлення ў пачатковых класах.

22. Развіццё маўлення малодшых школьнікаў у працэсе вывучэння прыметніка.

23. Праца над лексічнай сінанімікай як сродак узбагачэння маўлення вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

24. Лексіка-фразеалагічная праца як сродак маўленчага развіцця вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

25. Развіццё маўлення вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі на аснове вывучэння вобразных сродкаў мовы.

## Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў

**Абзац** – 1) водступ у пачатку радка, чырвоны радок; 2) частка тэксту, якая ўяўляе сабой асобны сэнсавы ўрывак і выдзяляецца водступам у першым радку.

**Актывізацыя слоўніка вучня** – праца настаўніка і вучня, накіраваная на пашырэнне актыўнага слоўніка кожнага вучня. Актывізацыя слоўніка вучня заключаецца ва ўключэнні новых слоў у розныя практыкаванні з заданнем выкарыстаць іх у складзеных сказах, словазлучэннях, тэкстах. У працэсе актывізацыі слоўніка вучня засвойваецца спалучальнасць слова з іншымі словамі, фарміруюцца граматычныя ўменні, паглыбляецца разуменне значэнняў слоў, у тым ліку і пераносных.

**Актыўны слоўнік вучня** – тая частка яго слоўніка, якая выкарыстоўваецца ім у яго самастойным вусным ці пісьмовым маўленні: дыялогах, апавяданнях, пераказах прачытанага, сачыненнях і г.д.

**Аналітыка-сінтэтычныя практыкаванні па беларускай мове** – практыкаванні, пры выкананні якіх пераважае аналітычная дзейнасць вучняў (назіранне над мовай, моўны аналіз).

**Апавяданне** – тып тэксту, у якім паведамляецца пра падзеі, якія адбыліся з аўтарам, вядомыя яму ці выдуманыя. Апавядальны тэкст разгортваецца ў часе, ён дынамічны. Сачыненне-апавяданне мае сюжэт, дзеючых асоб.

**Апісанне** – тып тэксту, у якім адлюстроўваюцца асобныя прадметы, некалькі прадметаў, даецца больш ці менш разгорнутае ўказанне прымет прадметаў і з'яў, адабраных у залежнасці ад задач выказвання, ад задумы апавядальніка.

**Арфаграфічная падрыхтоўка** – праца, якая праводзіцца непасрэдна перад напісаннем пераказу, накіраваная на папярэджванне арфаграфічных памылак.

**Аўдзіраванне** – від маўленчай дзейнасці, які прадугледжвае сэнсавае ўспрыманне маўлення.

**Вобразныя сродкі мовы** – мастацкія сродкі, заснаваныя на выкарыстанні слова ці спалучэння слоў у пераносным значэнні з мэтай узмацнення выразнасці, маляўнічасці маўлення.

**Выказванне** – акт камунікацыі, адзінка паведамлення, якая валодае сэнсавай цэласнасцю і можа быць успрынята слухачом.

**Гаварэнне** – від маўленчай дзейнасці, які заключаецца ў пераводзе ўнутранага маўлення ў акустычнае, у перакадзіроўцы думкі ў гукавыя сігналы. Вынік гаварэння – вуснае выказванне.

**Дыялог** – від вуснага маўлення (радзей – пісьмовага), які характарызуецца зменай выказванняў дзвюх ці некалькіх (у гэтым выпадку выкарыстоўваецца некаторы раз тэрмін палілог) гаворачых асоб.

**Задачы развіцця маўлення вучняў:**

1. Засваенне літаратурнай нормы мовы (школа вучыць дзяцей адрозніваць літаратурную мову ад прастамоўя, дыялектаў, жаргонаў, вучыць літаратурнай мове ў яе мастацкім, навуковым і гутарковым варыянтах; школьнікі павінны засвоіць нормы выкарыстання слоў, канструкцый, граматычных сродкаў, арфаэпічныя і арфаграфічныя нормы).

2. Засваенне навыкаў чытання і пісьма (разам з авалоданнем чытаннем і пісьмом дзеці авалодваюць асаблівасцямі пісьмовага маўлення, стылямі, жанрамі).

3. Удасканальванне культуры маўлення вучняў.

**Звязнае маўленне** – тэрмін, які выкарыстоўваецца ў методыцы ў трох значэннях:

1) дзейнасць гаворачага, працэс выражэння думкі;

2) тэкст, выказванне, прадукт маўленчай дзейнасці;

3) назва раздзела методыкі развіцця маўлення.

**Знешняе маўленне** выражаецца ў гуках ці графічных знаках, разлічана на ўспрыманне іншымі людзьмі.

**Культура маўлення** найчасцей выкарыстоўваецца ў трох значэннях:

– галіна лінгвістыкі, якая вывучае сістэму камунікацыйных якасцяў маўлення;

– сістэма камунікацыйных якасцяў, уласцівасцяў маўлення, такіх, як правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, багацце (разнастайнасць), дарэчнасць, сціласць (лаканічнасць), чысціня, мілагучнасць;

– сістэма ведаў, уменняў і навыкаў, якія забяспечваюць узорнае валоданне мовай у працэсе камунікацыі.

**Крытэрыі (патрабаванні) культуры маўлення:**

1. Змястоўнасць маўлення: у маўленні павінна быць раскрыта інфармацыя, важная для абодвух бакоў зносін.

2. Лагічнасць маўлення: яно павінна быць зразумелае, паслядоўнае, доказнае, пераканаўчае, інфарматыўнае, будавацца па канкрэтным плане, на аснове прадуманай кампазіцыі.

3. Свабоднае валоданне механізмамі маўлення: дыханнем, голасам, артыкуляваннем гукаў, дыкцыяй, інтанацыяй, маўленчымі рэакцыямі; хуткасць уключэння ў дыялог, добрая маўленчая аператыўная памяць. Важная хуткасць выбару слоў, пабудовы сказаў і тэксту. У пісьмовым маўленні да механізмаў адносяцца хуткасць пісьма, добры почырк, арфаграфія.

4. Моўная правільнасць маўлення, адпаведнасць літаратурнай норме. Моўная норма фарміруецца на аснове традыцыі, масавай прагматыкі, заканамернасцяў граматыкі, фанетыкі, словаўтварэння.

5. Дакладнасць, яснасць маўлення: культура маўлення вымяраецца ўменнем таго, хто гаворыць ці піша, выбраць такую сінтаксічную канстркуцыю, такія словы, спалучэнні, так пабудаваць сваё выказванне, каб перадаць найбольш важныя яго рысы, сваю задумку. Дакладнасць маўлення патрабуе багацця і рухомасці сродкаў мовы, іх разнастайнасці.

6. Камунікатыўная мэтазгодгасць маўлення: маўленне будуецца з улікам магчымасцяў адрасата, выбіраюцца тыя формы мовы, якія забяспечыаць найлепшы кантакт удзельнікаў дыялогу.

7. Выразнасць маўлення: разнастайнасць інтанацый і паўз, тону і тэмбру голаса ў вусным маўленні; выкарыстанне моўных сродкаў выразнасці ў вуснай і пісьмовай мове.

**Лексічнае значэнне** – гэта асноўны сэнс слова (яго змест); суаднесенасць таго ці іншага слова з пэўным паняццем ці з'явай.

**Лексічныя практыкаванні** – знаходжанне ў тэксце новых слоў ці новых значэнняў раней вядомых слоў, новых іх спалучэнняў, тлумачэнне значэнняў і мэтазгоднасці выкарыстання, аналіз складу слова і спосабаў іх утварэння, падбор аднакарэнных слоў, падбор сінонімаў, антонімаў, размежаванне амонімаў, складанне ўласных слоўнічкаў і праца з вучэбнымі слоўнікамі.

**Маналог** – гэта маўленне адной асобы.

**Маўленне** – гэта вербальныя, моўныя зносіны з дапамогай моўных знакавых адзінак: слоў, сінтаксічных канструкцый, тэксту, інтанацыі, часта пры падтрымцы невербальных сродкаў; спосаб перадачы думак праз мову, пры дапамозе і праз пасрэдніцтва мовы, гэта валоданне моваю, працэс моўных зносін паміж людзьмі, перадача думкі на адлегласць.

**Маўленчая дзейнасць** – гэта актыўны, мэтанакіраваны працэс стварэння і ўспрымання выказванняў, які ажыццяўляецца з дапамогай моўных сродкаў у ходзе ўзаемадзеяння людзей у розных сітуацыях зносін.

**Маўленчая сітуацыя** – гэта зыходная аснова выказвання, якая забяспечвае вучням жаданне ўступіць у маўленчыя зносіны і разуменне таго, да каго, навошта, пры якіх умовах адрасуецца іх выказванне.

**Маўленчыя памылкі** – гэта няўдала выбранае слова, няправільна пабудаваны сказ, скажоная марфалагічная форма. Да такіх памылак адносяцца:

1) лексіка-стылістычныя (паўтор слоў, выкарыстанне слова ў недакладным значэнні, парушэнне лексічнай спалучальнасці слоў, выкарыстанне слова без уліку яго эмацыянальнай афарбоўкі, выкарыстанне дыялектных і прастамоўных слоў і словазлучэнняў);

2) марфолага-стылістычныя (дзіцячая словатворчасць, выкарыстанне прастамоўных і дыялектных формаў слоў, пропуск марфем, утварэнне формаў множнага ліку тых назоўнікаў, якія выкарыстоўваюцца толькі ў адзіночным ліку);

3) сінтаксічна-стылістычныя (парушэнне нормаў кіравання, дапасавання, няўдалы парадак слоў у сказе, парушэнне сэнсавай сувязі займеннікаў з іншымі словамі, несуадносенне часавых і трывальных формаў дзеясловаў, парушэнне межаў сказа).

**Маўленчыя ўменні** – састаўная частка ўменняў па беларускай мове, звязаных з авалоданнем вучнямі як вусным, так і пісьмовым маўленнем.

**Метадычныя ўмовы для поспеху ў працы над маўленнем вучняў:**

1) стварэнне умоў, якія выклікаюць у малодшых школьнікаў патрэбнасць выказацца;

2) старанная падрыхтоўка матэрыялу для маўленчых практыкаванняў;

3) стварэнне добрага маўленчага асяроддзя.

**Методыка развіцця маўлення** вывучае метады і прыёмы ўзбагачэння і актывізацыі слоўніка вучняў, фарміраванне граматычнага ладу маўлення вучняў, звязнага маўлення – маналогу і дыялогу, апавядання, апісання і разважання, стыляў маўлення. Методыка развіцця маўлення вывучае ўзроўні валодання маўленнем на розных ступенях навучання і тыповыя памылкі, іх частату, прычыны іх ліквідацыі.

**Накірункі ў працы па развіцці маўлення:**

1) праца над словам: узбагачэнне і пашырэнне слоўнікавага запасу, удакладненне слоўніка, актывізацыя слоўнікавага запасу, ліквідацыя нелітаратурных слоў;

2) праца над словазлучэннем і сказам прадугледжвае практыкаванні на аснове ўзору (чытанне сказаў і іх аналіз); канструктыўныя практыкаванні (знаходжанне межаў сказа ў тэксце, напісаным без кропак і вялікіх літар, знаходжанне граматычнай асновы сказа з дапамогай пытанняў, выражэнне адной думкі ў некалькіх варыянтах сказаў); творчыя (складанне словазлучэнняў і сказаў па ілюстрацыях, па прапанаваных словах і г. д.);

3) праца над звязным маўленнем.

**Нататка** – гэта невялікае паведамленне ў публіцыстычным стылі пра падзею (ці факт) з жыцця, у якім аўтар гаворыць, што адбылося (ці адбудзецца), дзе, калі, з кім, па якой прычыне.

**Немаўленчыя памылкі:**

1) кампазіцыйныя (неадпаведнасць тэксту плану);

2) лагічныя (пропуск неабходных слоў, эпізодаў, парушэнне лагічнай паслядоўнасці і абгрунтаванасці, выкарыстанне ў адным радзе паняццяў розных узроўняў, парадаксальныя суджэнні);

3) фактычныя (скажэнне фактаў сапраўднасці).

**Пераказ** – від работы па развіцці маўлення, які фарміруе ўменне дакладна перадаваць змест выказвання, ствараць тэкст на аснове прапанаванага матэрыялу. Выдзяляюць наступныя віды пераказаў:

– па мэце правядзення: навучальны; кантрольны; з лінгвістычным заданнем;

– па спосабе перадачы зместу: блізкі да тэксту; выбарачны; з творчым заданнем;

– па адносінах да аб'ёму тэксту: падрабязны; сціслы;

– па ступені самастойнасці: з папярэдняй падрыхтоўкай; самастойны;

– па ўспрыманні тэксту: па праслуханым тэксце; па прачытаным тэксце; па тэксце, успрынятым на слых і зрокава;

– па адносінах да характару тэксту (па тыпу і стылі маўлення): пераказ-апісанне; пераказ-разважанне; пераказ-апавяданне з элементамі апісання; пераказ тыпу характарыстыкі; пераказ у навуковым, мастацкім ці публіцыстычным стылі;

– па форме маўлення: вусны; пісьмовы.

*Выбарачны пераказ* – пісьмовы пераказ адной з частак тэксту.

*Кантрольны пераказ* – пісьмовы пераказ тэксту па гатовым плане, без правядзення арфаграфічнай падрыхтоўкі, падрабязнага аналізу.

*Падрабязны пераказ* – падрабязны пісьмовы пераказ тэксту па гатовым ці калектыўна складзеным плане.

*Сціслы пераказ* – пісьмовы пераказ асноўнага зместу тэксту.

*Моўныя памылкі і недахопы пры пераказе:*

а) лексіка-стылістычныя памылкі, альбо слоўнікавыя: паўтарэнне аднаго і таго ж слова; недакладнасць ва ўжыванні слоў *(Бабёр хутка (нязграбна) падскочыў і заспяшаўся да ракі)*; ужыванне лішніх слоў *але, ну, вось, тады, і*; ужыванне слоў не ў тым значэнні *(нечакана (неўзабаве) гукнуў)*;

б) да групы марфолага-стылістычных памылак адносяцца: няправільныя ўтварэнні слоў і формаў слоў, няправільнае словаўтварэнне *(вусы натапырваюцца (тапырацца))*; утварэнне нелітаратурных формаў *(да грудзёў (грудзей)*;

в) памылкі ў словазлучэннях і сказах – сінтаксічна-стылістычныя, граматычныя: няправільны парадак слоў; няўменне вызначаць межы сказаў; няправільнае ўжыванне часоў дзеяслова; памылкі ў пабудове словазлучэнняў.

*Памылкі ў змесце:*

а) тэма не раскрыта, раскрыта няпоўна;

б) прапушчаны важны момант;

в) значнае месца займае другаснае;

г) няма абгрунтавання падзей;

д) не ўказаны час і месца дзеяння;

е) ёсць скажэнне фактаў.

*Работа над пераказам у першым класе.* У першым клас ідзе падрыхтоўчая работа, якая пачынаецца з аналізу тэксту і работы над яго зместам. Аналіз тэксту праводзіцца з мэтай высвятлення зместу і паслядоўнасці яго раскрыцця (лагічны бок), тлумачэння значэння асобных слоў у кантэксце і па-за кантэкстам. У першым класе дзеці вучацца ўспрымаць тэкст на слых, вызначаць яго галоўную думку і паслядоўна перадаваць змест. Пачынаць фарміраваць гэтыя навыкі можна на тэкстах, якія сустракаюцца ў буквары.

Прыкладна ў 4 чвэрці, калі першакласнікі набудуць навыкі самастойна адказваць на пытанні, трэба вучыць даваць загалоўкі ў форме пытальных сказаў часткам тэксту, г. зн. складаць план. Вучні дзеляць тэкст на сэнсавыя часткі.

*Работа над пераказам у другім класе.* У другім класе работа над пераказам ускладняецца. Дзеці пішуць пераказы на аснове сюжэтных тэкстаў. Новыя патрабаванні ставяцца і да работы над планам. У другім класе дзеці разбіваюць тэкст на лагічныя часткі і складаюць план калектыўна.

Паступова траба ўводзіць пераказы па гатовым плане з апавядальных сказаў. Адначасова вядзецца работа над сказам. Больш увагі надаецца развіццю інтанацыйнага слыху дзяцей.

Большасць тэкстаў у другім класе трэба запісваць на дошцы. Дзеці вучацца чытаць іх уголас і правільна перадаваць інтанацыю.

Неабходна вучыць дзяцей складаць план самастойна. Працуючы над планам, малодшыя школьнікі вучацца разумець тэкст як цэлае, складзенае з асобных частак. Дакладны адказ на пытанне плана лагічна звязваецца з адказамі на іншыя пытанні, не парушаючы звязнасці тэксту.

*Работа над пераказам у трэцім класе.* Дзеці працягваюць вучыцца вызначаць галоўную думку тэкстаў, дзяліць іх на лагічныя часткі, складаць планы ў форме пытанняў і ў выглядзе загалоўкаў частак. Шмат увагі надаецца працы, накіраванай на асэнсаванне кампазіцыйнай структуры і ўнутранай логікі навучальных пераказаў рознай будовы.

Праца над тэкстам у трэцім класе праводзіцца ў два этапы.

На першым этапе выконваецца рознабаковы лагічны і сэнсава-граматычны аналіз тэксту. Настаўнік чатае тэкст 1–2 разы. Вызначаецца тэма і галоўная думка тэксту. Вучні калектыўна, пад кіраўніцтвам настаўніка, дзеляць яго на лагічныя часткі, знаходзяць апорныя сказы ў іх, даюць загалоўкі часткам, абапіраючыся на апорныя сказы, або ставяць пытанні да іх.

Далей праводзіцца сэнсава-граматычная праца на матэрыяле тэксту. Асновай для такой працы з'яўляюцца словы, папярэдне запісаныя настаўнікам на дошцы. Вучні складаюць з імі словазлучэнні, сказы. Затым малодшыя школьнікі пераказваюць тэкст, прытрымліваючыся плана. Настаўнік ацэньвае іх працу,

аналізуе звязныя выказванні, называе памылкі, якія дапусцілі вучні і якія яшчэ яны могуць дапусціць пры напісанні пераказу. Толькі пасля такой глыбокай і рознабаковай працы на матэрыяле тэксту вучні пераходзяць да другога этапа – пачынаюць самастойна пісаць пераказ.

*Работа над пераказам у чацвёртым класе.* У чацвёртым класе праводзяцца падрабязныя, ці блізкія да тэксту, сціслыя, выбарачныя, творчыя (з творчымі заданнямі) пераказы, пераказы з граматычнымі заданнямі. Як і ў папярэдніх класах, вялікае значэнне надаецца працы над планам. Дзеці спачатку калектыўна, а пазней і самастойна складаюць план, вучацца вычляняць сэнсавыя часткі; адлюстроўваць у плане галоўныя думкі частак; улічваць стылістычныя асаблівасці тэксту, прычым першыя два патрабаванні вучні ведаюць з папярэдняга класа. З трэцім іх неабходна пазнаёміць.

Як і ў папярэдніх класах, найбольш часта пішуцца падрабязныя пераказы. Для гэтай мэты выкарыстоўваюцца апавядальныя тэксты. Яны бываюць як сюжэтныя, так і інфармацыйныя.

У аснове апавядання як жанру ляжыць нейкі выпадак (падзея). Вядома, што ў навучальных тэкстах аб'ёмам 70–90 слоў не заўсёды ёсць усе структурныя часткі. На будове тэкстаў, лексічных і граматычных сродкаў сувязі трэба заўсёды засяроджваць увагу школьнікаў, паколькі развіццё звязнага маўлення – гэта не што іншае, як авалоданне ўменнямі, неабходнымі для пабудовы выказванняў у форме апавядання, апісання, разважання, а гэта вымагае глыбокага аналізу як лагічнай, так і кампазіцыйнай структураў.

Але большасць тэкстаў мае няпоўную кампазіцыйную структуру апавядання. Да іх настаўнік можа ставіць дадатковыя творчыя заданні тыпу:

– Раскажыце (напішыце), што было пасля (да таго моманту), які апісаны ў тэксце.

– Якая частка апавядання адсутнічае (не разгорнута)?

– Дапішыце (разгарніце) яе.

**Метадычныя рэкамендацыі настаўніку пачатковых класаў да падрыхтоўкі і правядзення пераказу.** Настаўніку неабходна грунтоўна рыхтавацца да ўрокаў, на якіх праводзіцца пераказ. Пасля вывучэння тэксту для будучага пераказу настаўнік вызначае словы, выразы і сказы, з якімі трэба пазнаёміць дзяцей за некалькі дзён да адпаведнага ўрока. На ўроку, калі праводзіцца пераказ, разглядаюцца словы і словазлучэнні, значэнне якіх залежыць ад кантэксту (фразеалагізмы, словы ўжытыя ў пераносным значэнні). Іх настаўнік тлумачыць ва ўступнай гутарцы да пераказу і запісвае на дошцы.

Пры напісанні пераказу вучні могуць карыстацца пямяткамі, якія падкажуць паслядоўнасць дзеянняў.

Пасля праверкі работ настаўнікам праводзіцца аналіз пераказу і работа над памылкамі (з адпаведным запісам у класны журнал і сшытак). Вялікае месца ў сістэме навучання пераказу належыць рабоце над памылкамі, у выніку якой вучні набываюць навыкі рэдагавання пісьмовых прац, уласных і чужых.

Вызначыўшы тып памылак, настаўнік прадумвае методыку пабудовы ўрока. Выпраўляе тыя памылкі, з якімі школьнікі самі не справяцца. Астатнія памылкі можна толькі абазначыць.

У чацвёртым класе праграма рэкамендуе адводзіць на аналіз і разбор работ школьнікаў асобныя ўрокі. У залежнасці ад характару памылак на ўроку праводзіцца як калектыўная работа для іх выяўлення, так і індывідуальная.

Пры навучанні пераказу трэба ўлічваць, што мова малодшых школьнікаў знаходзіцца пад моцным уплывам бытавой, гутарковай мовы, якая, як вядома, адрозніваецца ад пісьмовай сваімі лексічнымі сродкамі і сінтаксічнымі канструкцыямі. Таму ў час працы над пераказам трэба вучыць дзяцей карыстацца літаратурнай мовай, паступова выпрацоўваць уменні, якія дапамагаюць будаваць звязныя выказванні.

**Пісьмо** – прадуктыўны тып маўленчай дзейнасці, пры якой інфармацыя перадаецца на адлегласць з дапамогай графічных знакаў.

**Прыёмы выпрацоўкі навыкаў літаратурнага вымаўлення:** паказ настаўнікам узору вымаўлення, правільнае выразнае чытанне вучнямі дамашніх і класных практыкаванняў, запісванне ў слоўнік цяжкіх у арфаэпічных адносінах слоў, складанне словазлучэнняў і сказаў з гэтымі словамі і інш.

**Прынцыпы развіцця маўлення:**

1. Адзінства развіцця маўлення і мыслення. Развіваць мысленне малодшага школьніка – гэта значыць вучыць яго такім мысліцельным аперацыям, як параўнанне, аналіз, сінтэз, абагульненне, сістэматызацыя, індукцыя, дэдукцыя, уменне вызначаць часавыя сувязі і прычынна-выніковую залежнасць.

2. Узаемасувязь вуснага і пісьмовага маўлення.

3. Сувязь працы па развіцці маўлення з вывучэннем граматыкі, арфаграфіі і пунктуацыі. Гэтая сувязь арганічная. Пры вывучэнні асноўных раздзелаў граматыкі настаўнік увесь час працуе над развіццём дару слова, узбагачэннем маўлення вучняў літаратурнай лексікай.

4. Стылістычная накіраванасць развіцця маўлення. Паводле гэтага прынцыпу, на ўроках чытання, граматыкі і правапісу малодшыя школьнікі навучаюцца мастацкаму стылю мовы, авалодваюць элементамі фразеалогіі, вучацца пабудове сказаў, звязнаму маўленню, вусным і пісьмовым пераказам і сачыненням.

**Прычыны стылістычных памылак у маўленні вучняў:** беднасць слоўніка, уплыў маўленчага асяроддзя, невысокае маўленчае развіццё малодшых школьнікаў, малы маўленчы вопыт, недастатковая развітасць пачуцця мовы, недастатковая падрыхтоўка тэксту, непрадуманасць сказа, няведанне ролі займеннікаў, псіхалагічны стан гаворачага і г. д.

**Развражанне** – тып тэксту, сутнасць якога заключаецца ў пабудове ланцужка высноў на выбраную тэму, дзе з папярэдняга меркавання вынікаюць наступныя. У развражанні звычайна вылучаюць наступныя часткі: тэзіс, г. зн. думка, якая павінна быць даказана; развіццё тэзісу, яго доказ (ці абвяржэнне), аргументы; вывад, г. зн. пацвярджэнне правільнасці (ці няправільнасці) тэзісу.

**Развіццё маўлення вучняў** – педагагічны працэс, які мае мэтай фарміраванне ў вучняў навыкаў практычнага валодання літаратурнай мовай.

**Рэдагаванне** – гэта праверка і выпраўленне логіка-змястоўнага і стылістычна-маўленчага бакоў тэксту з мэтай яго паляпшэння.

**Сачыненне і пераказ** – гэта віды маўленчых практыкаванняў, асаблівасць якіх у тым, што яны прадугледжваюць стварэнне ў вучэбных мэтах звязных тэкстаў, цэлых выказванняў, а таму накіраваны на фарміраванне ўсяго комплексу маўленчых уменняў. *Пераказ* – больш ці менш творчае, у залежнасці ад віду, узнаўленне тэксту-ўзору. *Сачыненне* – стварэнне ўласнага выказвання.

**Сачыненне** – работа творчага характару, якая патрабуе дакладнага, аргументаванага і лагічна паслядоўтага выкладу ўласных думак на пэўную тэму.

*Схема працы над сачыненнем:*

1) слуханне (чытанне) тэксту-ўзору;
2) аналіз тэксту ў працэсе суразмоўніцтва;
3) творчы запіс тэксту па частках;
4) камунікатыўныя практыкаванні;
5) усведамленне дыдактычнай мэты, звязанай са стварэннем уласнага тэксту на пэўную тэму;
6) праца над вусным тэкстам у парах;
7) праца над пісьмовым тэкстам (чарнавы варыянт);
8) паляпшэнне напісанага, праверка (самаправерка, узаемаправерка);
9) запіс тэксту.

*Віды сачыненняў:*

– па мэце правядзення: навучальныя; кантрольныя; з граматычным заданнем;

– па крыніцы і характары матэрыялу: на аснове жыццёвага вопыту вучняў; на аснове літаратурных твораў; на аснове кінафільмаў, тэлеперадач, твораў жывапісу, тэатральных пастановак; на аснове асабістых назіранняў; на аснове фантазіі;

– па аб'ёме гатовага тэксту: разгорнутае; мініяцюра;

– па тэматыцы: на літаратурную тэму; на лінгвістычную тэму; на вольную тэму;

– па спосабе выкладу думак: апісанне, апавяданне або разважанне; сачыненне змешанага тыпу маўлення; нататка, рэцэнзія, рэпартаж, нарыс, навуковае паведамленне;

– па стылі: мастацкае; навуковае; дзелавое; публіцыстычнае;

– па ступені самастойнасці: з працяглай падрыхтоўкай; без папярэдняй падрыхтоўкі; самастойнае.

**Сістэма выпраўлення і папярэджавання памылак у маўленні** распрацоўваецца на аснове дыягностыкі і ўключае ў сябе:

1) выпраўленне маўленчых памылак у сшытках вучняў;

2) складанне картатэкі тыповых памылак, дапушчаных у вусным і пісьмовым маўленні;

3) вызначэнне тыпаў памылак і іх прычын;

4) класная праца над агульнымі тыповымі памылкамі на ўроках аналізу пісьмовых творчых прац вучняў;

5) індывідуальная ці групавая праца над асобнымі памылкамі: іх знаходжанне, высвятленне, выпраўленне;

6) паказ і аналіз узорных тэкстаў (сказаў);

7) сістэма стылістычных і іншых практыкаванняў;

8) моўная падрыхтоўка перад творчымі працамі вучняў;

9) навучанне самаправерцы напісанага і яго рэдагаванне;

10) стылістычныя акцэнты пры вывучэнні граматычных тэм.

**Слоўнікава-граматычныя практыкаванні** служаць сродкам замацавання граматычных ведаў вучняў і адначасова ўзбагачаюць мову малодшых школьнікаў.

**Слоўнікава-лагічныя практыкаванні** вучаць параўноўваць, абагульняць і сістэматызаваць прадметы і з’явы (падвядзенне відавых паняццяў пад родавыя: асіна, бяроза, сасна, вярба, алешына – дрэвы; аб’яднанне прадметаў у групы на аснове прызначэння, функцыі і г. д. (мэбля, школьныя прыналежнасці, прафесіі і

інш.); падзел паняцця: назавіце звяроў нашых лясоў, назавіце драпежных звяроў нашых лясоў; назавіце птушак, якія жывуць у нашых лясах, назавіце птушак, якія адлятаюць ад нас на поўдзень).

**Слоўнікава-стылістычныя практыкапванні** выпрацоўваюць увагу да значэння слова, а таксама дакладнасць і вобразнасць маўлення (падабраць да слова сінонімы і антонімы; скласці сказы з сінонімамі; замяніць словы, якія паўтараюцца ў тэксце, сінанімічнымі).

**Слоўнікавая праца** – гэта сістэматычная, мэтанакіраваная праца ў галіне лексікі, якая праводзіцца з мэтай авалодання вучнямі цяжкімі словамі (В. А. Дабрамыслаў); вобласць методыкі развіцця маўлення, якая ахоплівае засваенне новых слоў і значэнняў, іх адценняў, эмацыянальна-экспрэсіўных афарбовак слоў, сфер іх выкарыстання, засваенне мнагазначнасці, сінонімаў, антонімаў, амонімаў.

**Слоўнікавы запас** – гэта сукупнасць слоў, якія разумее і выкарыстоўвае ў сваім маўленні чалавек.

**Слуханне** – разнавіднасць маўленчай дзейнасці, якая заключаецца ва ўспрыманні пісьмовай мовы.

**Тэкст** – некаторая (закончаная) паслядоўнасць сказаў, звязаных па сэнсе адзін з адным у рамках агульнай задумы аўтара.

**Узроўні працы па развіцці маўлення:**

1) *вымаўленчы ўзровень* (праца на гэтым узроўні праходзіць па трох накірунках: праца над тэхнікай маўлення (праца над дыханнем і дыкцыяй); арганізацыя практычнага засваення малодшымі школьнікамі арфаэпічных нормаў беларускай літаратурнай мовы; удасканаленне інтанацыйных уменняў вучняў;

2) *лексічны ўзровень* (праца над словам, якая праводзіцца па чатырох накірунках: узбагачэнне слоўніка; удакладненне слоўніка; актывізацыя слоўніка; пазбаўленне ад нелітаратурных слоў);

3) *граматычны ўзровень* (сінтаксічная праца, г. зн. праца над словазлучэннем і сказам), дзе на першы план выходзіць пабудова сінтаксічных канструкцый;

4) *узровень тэксту* (праца над звязным маўленнем, якая праходзіць па двух накірунках: праца над стварэннем звязных вусных выказванняў і праца над звязнымі пісьмовымі выказваннямі).

**Унутранае маўленне** – гэта «мысленнае» маўленне, звернутае як бы да самога сябе.

**Урокі развіцця маўлення** – гэта ўрокі, якія праводзяцца з мэтай фарміравання і ўдасканалення ў вучняў камунікатыўных уменняў і навыкаў.

**Фактары, якія адыгрываюць важную ролю ў станаўленні і развіцці маўлення:**

1) станоўчыя эмоцыі, якія садзейнічаюць развіццю маўленчай дзейнасці вучня (захапляльнасць, цікаўнасць, натхненне);

2) у развіцці дзіцяці эмоцыі папярэднічаюць інтэлекту; у сучаснай сістэме адукацыі свет інтэлекту звычайна адсоўвае эмоцыі на другі план, парушаючы гармонію эмацыянальнага і інтэлектуальнага;

3) фізіялагічнае развіццё органаў маўлення, маўленчых цэнтраў мозга, памяці, органаў гаварэння, аўдзіравання; працэс навучання не ўлічвае гэтага, так як амаль уся пазнавальная дзейнасць школьнікаў адбываецца на мысліцельным узроўні: чытанне самому сабе, абдумванне, выкананне пісьмовых практыкаванняў, слуханне настаўніка не дазваляюць развіваць уласнае маўленне вучняў;

4) патрэбнасць змястоўных зносін;

5) патрэбнасць і здольнасць намінацыі і абагульнення (развіццё інтэлекту); па багацці слоўніка мяркуюць аб ведах чалавека, дакладнасці выбару слоў, механізме пабудовы сказа і тэксту;

6) фактар маўленчага асяроддзя (назапашваючы ў памяці матэрыял, чалавек устанаўлівае аналогіі, сістэмныя сувязі; лёгка засвойваюцца тыя нормы, якія з'яўляюцца сістэматычнымі, і цяжка – выключэнні з правіл; вельмі важна, каб маўленчае асяроддзе, у якім фарміруецца дзіця, было культурным);

7) фактар маўленчай актыўнасці: патрэбна разнастайная, пастаянная практыка маўлення.

*Умовы маўленчай актыўнасці:*

– агульная актыўнасць чалавека, яго камунікабельнасць, ініцыятыўнасць;

– уменне пераадольваць сарамлівасць;

– здольнасць пераходзіць ад сітуацыйнага дыялогу да маналогу, абдуманага, спланаванага маўлення;

8) фактар вывучэння моўнай тэорыі.

*Уплыў вывучэння тэорыі мовы на маўленчае развіццё заключаецца ў наступным:*

– моўная тэорыя ўдасканальвае мысленне вучняў, павышае культуру абстрактнага мыслення, узбагачае змястоўную базу маўлення;

– засваенне тэарэтычных ведаў, як правіла, працякае як асэнсаванне практыкі засваення маўлення;

– граматычныя і іншыя правілы забяспечваюць авалоданне нормамі мовы, што дазваляе кантраляваць уласнае і чужое маўленне.

**Чытанне** – від маўленчай дзейнасці, накіраваны на сэнсавае ўспрыманне графічна зафіксаванага тэксту. Мэта чытання – атрыманне і перапрацоўка пісьмовай інфармацыі.

## Метадычныя рэкамендацыі

Пачатак
Змест
Старонка 96 из 100
Назад
На ўвесь экран
Загарнуць

# Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» ў агульнаадукацыйных установах з беларускай (рускай) мовай навучання»

## Ацэнка вынікаў

# Вучнёўскае сачыненне «Прыгожы лісток»

## Прыгожы лісток



Сачыненне

Прыгожы лісток

Адзін цікаўны лісток апаў на акно школы. Хлопчык заўважыў яго. Пасля яны з настаўніцай пайшлі на вуліцу збіраць рознакаляровае лісце. Атрымаўся прыгожы восеньскі букет! Дзецям вельмі спадабалася. Настаўніца паставіла букет у вазу.

Бялевіч Данііл

## Восенькі букет



Сачыненне

Восенькі букет

Каля школы расло шмат маладых клёнаў. Восенню лісце на іх стала жоўтае і чырвонае. Лёгкі ветрык наляцеў на дрэвы і закружыў рознакаляровыя лісточкі ў вясёлым карагодзе.

Адзін цікаўны лісток ветрык занёс да акна школы. Ён убачыў, як вучні вучыліся ў школе. Ён таксама захацеў у школу. Пасля ўрокаў вучні з настаўніцай пайшлі за лісцем. Яны сабралі прыгожыя букеты. Настаўніца свой букет паставіла ў вазу.

Васілеўская Ганна

## Грыбнікі



Грыбнікі

Раніца нядзелі выдалася сонечнай. Мы з татам і мамай паехалі ў лес. Ужо ўзялі ў рукі кошыкі і рушылі па сцяжынцы. Пад нагамі шамасцела восеньскае лісце.

Я зазірнула пад кусцік і ўбачыла вялікі баравік. Толькі выняла ножык, каб зрэзаць грыб, а ён ускапіўся на ножкі. Гэта вожык панёс у норку мой баравік.

Праз гадзіну ў нас былі ўжо поўныя кошыкі. Я задаволеная вярталася дадому.

Кандрацьева Анастасія